УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ”

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

## МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
***(электронны варыянт)***

**для студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументнай камунікацыі**

Складальнікі:

*А.М.Пісарэнка*, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Рэкамендавана да зацвярджэння

кафедрай беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 4 ад 12.11.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск 2011**

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Сучасная літаратурная мова” выкладаецца студэнтам спецыяльнасці “Літаратурная работа” спецыялізацыі Драматургія, займае адно з цэнтральных месцаў у сістэме навучальных дысцыплін і мае тэарэтычна-практычны характар. Асноўная мэта выкладання дысцыпліны: выпрацоўка і практычнае замацаванне ўменняў і навыкаў правільнага, дакладнага, выразнага, разнастайнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай, развіццё моўна-эстытычнага густу студэнтаў, фарміраванне ўстаноўкі на практычнае прымяненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх літаратурна-мастацкай дзейнасці, выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, найперш да слова беларускага, імкнення да далейшага ўзбагачэння роднай мовы і роднай літаратуры.

Задачы курса:

– даць будучым кінадраматургам, супрацоўнікам сферы культуры, друку навуковыя веды пра лексічны склад, фразеалагічны фонд, фанетычную сістэму, граматычны лад беларускай мовы;

– выпрацаваць навуковы погляд на факты сучаснай літаратурнай мовы і дапамагчы ў практычным авалоданні моўнымі нормамі ўсіх узроўняў: фанетыка-арфаэпічнага, арфаграфічнага, лексіка-фразеалагічнага, граматычнага і пунктуацыйнага;

– прывіць навыкі самастойнага аналізу моўных фактаў з тым, каб суаднесці іх з пэўным функцыянальным стылем, падстылем і жанрам, з адпаведнай лінгвістычнай і экстралінгвістычнай сітуацыяй;

– выпрацаваць навыкі самастойнага стварэння сродкаў выразнасці і вобразнасці мовы на ўсіх моўных узроўнях.

Навукова-тэарэтычныя веды, атрыманыя на лекцыйных і практычных занятках, падмацоўваюцца выкананнем творчых заданняў, што ў сваю чаргу паўплывае на ўдасканаленне моўнага густу творцаў, на фарміраванне арыгінальнага мастацкага светапогляду і, безумоўна, будзе адлюстравана ў адметнасці аўтарскіх стыляў.

У адпаведнасці з акрэсленымі задачамі праграма курса ахоплівае ўводзіны, фанетыку, арфаэпію, графіку, арфаграфію, лексікалогію і лексікаграфію, фразеалогію і фразеаграфію, марфеміку і словаўтварэнне, граматыку: марфалогію і сінтаксіс, пунктуацыю.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

– паходжанне і ўмовы гістарычнага развіцця беларускай літаратурнай мовы;

– асаблівасці фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай мовы;

– асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення галосных і зычных гукаў, іх спалучэнняў у лексіцы як спрадвечна беларускай, так і запазычанай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сучасныя нормы беларускага правапісу і ўсе прынцыпы, на якіх грунтуецца арфаграфічная сістэма;

– спецыфіку лексічнага складу беларускай мовы, яго адметнасць з боку сферы ўжывання, актыўнасці функцыянавання, стылістычнай дыферэнцыяцыі і г.д.;

– адметнасць беларускай фразеалогіі;

– лексікаграфічныя і фразеаграфічныя даведнікі;

– сістэму знамянальных і службовых часцін мовы, іх семантычную адметнасць і асаблівасці іх словаўтварэння, словазмянення і функцыянавання;

– спецыфіку сінтаксічнага ладу сучаснай беларускай літаратурнай мовы і пунтуацыйныя нормы;

– моўныя асаблівасці стыляў;

– камунікатыўныя якасці маўлення;

– стылістычныя сродкі ўзбагачэння мастацкага стылю на ўсіх моўных узроўнях.

Студэнты таксама павінны ўмець:

– граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай, усімі яе як вуснымі, так і пісьмовымі нормамі;

– знаходзіць і выпраўляць арфаграфічныя, граматычныя памылкі і стылёвыя недахопы мастацкіх, навуковых і іншых тыпаў тэкстаў;

– самастойна аналізаваць лінгвістычныя факты з пункту погляду іх адпаведнасці моўным законам сучаснай беларускай мовы;

– ствараць вобразныя сродкі мовы (тропы і фігуры) з мэтай індывідуалізацыі мастацкага стылю;

– матывавана выкарыстоўваць сродкі стварэння выразнасці тэксту на фанетычным, лексічным, фразеалагічным і іншых моўных узроўнях;

– ствараць тэксты розных стыляў, падстыляў і жанраў;

– выкарыстоўваць разанастайныя сродкі стылізацыі мовы персанажаў у драматургічным і празаічным кантэкстах;

– аналізаваць мову твораў пісьменнікаў ранейшага пакалення і сучасных аўтараў.

Выкарыстоўваючы прынцып пераемнасці і ўзаемасувязі лінгвістычных дысцыплін, у курсе адлюстроўваецца сувязь дысцыпліны “Сучасная літаратурная мова” са “Стылістыкай мовы” і “Культурай мовы”, з “Асновамі тэорыі літаратуры”, “Сучаснай рускай мовай”, “Літаратурна-мастацкай крытыкай”, “Беларускай і сусветнай літаратурай” і інш.

Усяго па дысцыпліне тыпавымі планамі прадугледжана 336 гадзін, з якіх 172 аўдыторныя (52 лекцыйныя і 120 практычныя) гадзіны. Форма кантролю – 2 экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

*для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (напрамак 1-23 01 11- 04 бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка) спецыялізацыя 1-23 01 11- 04 01 беларуская мова і літаратура)*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс "Сучасная беларуская літаратурная мова" як вучэбная дысцыпліна, што выкладаецца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (спецыялізацыя ***"бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура"***) займае адно з цэнтральных месцаў у сістэме лінгвістычных дысцыплін. За адведзены вучэбным планам час студэнты павінны засвоіць лексічнае і фразеалагічнае багацце, фанетычную сістэму і граматычны лад беларускай мовы, а таксама набыць трывалыя навыкі правільнага пісьма па-беларуску, навучыцца самастойна аналізаваць моўныя факты. У адпаведнасці з гэтым праграма курса складаецца з наступных раздзелаў:

Уводзіны
Фанетыка
Арфаэпія
Графіка
Арфаграфія
Лексікалогія і лексікаграфія
Фразеалогія і фразеаграфія
Марфеміка
Словаўтварэнне
Граматыка: марфалогія, сінтаксіс
Пунктуацыя

На вывучэнне курса адведзена 134 аўдыторныя гадзіны, з іх 70 гадзін лекцыйных і 64 практычныя. Гэты час неабходна выкарыстаць для азнаямлення студэнтаў з дыскусійнымі, мала распрацаванымі пытаннямі (станы дзеяслова, безасабова-прэдыкатыўныя словы, мадальныя словы, звязкі; некаторыя асаблівасці сказаў камбінаванай будовы, звышфразавага адзінства, перыяду; агляду арфаграфічных нормаў з улікам рэформы правапісу і інш.). Значная частка гадзін курса плануецца на практычныя і семінарскія заняткі, мэта якіх – паглыбіць і замацаваць тэарэтычны матэрыял, што асвятляўся на лекцыях ці вывучаўся самастойна, выпрацаваць у студэнтаў навыкі самастойнага аналізу моўных з'яў. Пытанні, вынесеныя для абмеркавання на практычных, семінарскіх занятках, а таксама прапанаваныя для самастойнага вывучэння, падаюцца ў канцы кожнага раздзела курса.

Кожны раздзел курса "Сучасная беларуская літаратурная мова" важны, таму што ў ім утрымліваецца матэрыял, неабходны студэнтам для працы і ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школе, і ў бібліятэцы, дзе яны павінны карыстацца беларускай мовай як прафесійным сродкам і прапагандаваць беларускую мову.

Вывучэнне роднай мовы (як часткі нацыянальнай культуры) у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў праводзіцца на гістарычным, культуралагічным, краязнаўчым матэрыяле, што дае магчымасць узбагаціць веды студэнтаў гістарычнымі фактамі, зацікавіць культурай роднага краю, вызначыць месца Беларусі ў агульнаеўрапейскай культурнай плыні.

У канцы праграмы падаецца спіс літаратуры (асноўная, дадатковая, слоўнікі). Зразумела, што тут не пералічваецца ўся патрэбная літаратура, таму да кожнай тэмы выкладчык прапануе іншыя выданні, у тым ліку слоўнікі і артыкулы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэматычны план для студэнтаў ФІДК

па «Сучаснай беларускай літаратурнай мове»

| Раздзелы і тэмы | Формы заняткаў, колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. |
| **Раздзел І. Уводзіны** | | | |
| Тэма 1. Прадмет, задачы і змест курса | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІ. Фанетыка** | | | |
| Тэма 2. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Сістэмы вакалізму і кансанантызму ў беларускай мове | 5 | 4 | 1 |
| Тэма 3. Склад. Тыпы складоў у беларускай мове. Складападзел. Асаблівасці беларускага націску | 3 | 2 | 1 |
| Тэма 4. Фанетычная транскрыпцыя. Фанетычны аналіз слова | 2 | | 2 |
| **Раздзел ІІІ. Арфаэпія** | | | |
| Тэма 5. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства.Асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення і прычыны адхілення ад іх | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел ІV. Графіка** | | | |
| Тэма 6. Графіка як раздзел мовазнаўства. Суадносіны паміж гукамі і літарамі. Графічны аналіз | 3 | 1 | 2 |
| **Раздзел V. Арфаграфія** | | | |
| Тэма 7. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Прынцыпы беларускай арфаграфіі | 5 | 3 | 2 |
| Тэма 8. Ужыванне вялікай літары. Злітнае і паўзлітнае напісанне. Правапіс мяккага знака і апострафа | 3 | 1 | 2 |
| **Раздзел VІ. Лексікалогія і лексікаграфія** | | | |
| Тэма 9. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Адназначныя і мнагазначныя словы. Аманімія ў мове | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 10. Паранімія і паранамазія. Сінанімія. Антанімія | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 11. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Актыўная і пасіўная лексіка | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 12. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 13. Беларуская лексікаграфія | 2 | 1 | 1 |
| **Раздзел VІІ. Фразеалогія і фразеаграфія** | | | |
| Тэма 14. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Тыпы фразеалагізмаў | 6 | 4 | 2 |
| Тэма 15. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Беларуская фразеаграфія | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел VІІІ. Граматыка. Марфалогія** | | | |
| Тэма 16. Граматыка як раздзел мовазнаўства | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 17. Словаўтварэнне як раздзел марфалогіі. Марфемная структура слова. Тыпы марфем | 6 | 4 | 2 |
| Тэма 18. Корань слова. Афіксоіды. Афіксы | 6 | 2 | 4 |
| Тэма 19. Змяненні ў марфемнай будове слова | 2 | 2 | |
| Тэма 20. Тыпы і спосабы сучаснага словаўтварэння | 7 | 3 | 4 |
| Тэма 21. Марфемны, словаўтваральны і этымалагічны аналіз будовы слова | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 22. Марфалогія як граматычнае вучэнне аб словах і словаформах. Сістэма часцін мовы, прынцыпы іх класіфікацыі | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 23. Знамянальныя, або самастойныя, часціны мовы | 18 | 10 | 8 |
| Тэма 24. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы як асобая часціна мовы | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 25. Службовыя часціны мовы. Гукапераймальныя словы і выклічнікі | 8 | 4 | 4 |
| **Раздзел IX. Сінтаксіс і пунктуацыя** | | | |
| Тэма 26. Сінтаксіс як раздзел граматыкі. Словазлучэнне і яго тыпы | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 27. Сказ як сінтаксічная адзінка. Просты сказ. Галоўныя і даданыя члены сказа | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 28. Ускладнены сказ. Сінтаксічнае ўскладненне простага сказа | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 29. Аднасастаўныя сказы і іх тыпы. Няпоўныя сказы | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 30. Камунікатыўная арганізацыя простага сказа | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 31. Складаны сказ | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 32. Асноўныя адзінкі і структура звязнай мовы | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 33. Чужая мова і асноўныя спосабы яе перадачы | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 34. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку | 1 | 1 | |
| Усяго | 134 | 70 | 64 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I
## УВОДЗІНЫ

### Тэма 1. Прадмет, задачы і змест курса

Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа, яе літаратурная і дыялектная разнавіднасці.

Сучасная беларуская літаратурная мова, яе вусная і пісьмовая формы.

Нормы літаратурнай мовы. Асаблівасці развіцця беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Функцыянальныя стылі, узровень іх развіцця на сучасным этапе.

Паходжанне беларускай мовы, гістарычныя ўмовы яе развіцця. Беларуская мовы і іншыя славянскія мовы.

## Раздзел II
## ФАНЕТЫКА

### Тэма 2. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Сістэмы вакалізму і кансанантызму ў беларускай мове

Фанетыка, яе прадмет, задачы і змест. Гук – найменшая адзінка мовы. Паняцце фанемы і яе адрозненне ад гука. Фізіялагічны, акустычны і лінгвістычны аспекты вывучэння гукаў мовы. Моўны апарат.

Сувязь фанетыкі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (арфаэпіяй, графікай, арфаграфіяй і інш.).

Сістэма вакалізму. Класіфікацыя галосных гукаў паводле спосабу і месца ўтварэння. Лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя галосныя гукі. Моцная і слабая пазіцыя галосных гукаў. Аканне. Пазіцыйныя змяненні галосных. Гістарычныя чаргаванні галосных гукаў. Прыстаўныя і ўстаўныя галосныя.

Сістэма кансанантызму. Класіфікацыя зычных паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, цвёрдасці і мяккасці. Няпарныя глухія–звонкія, цвёрдыя–мяккія гукі. Зацвярдзелыя зычныя.

Змены і чаргаванні зычных гукаў. Асіміляцыя і дысіміляцыя. Фанетычнае падаўжэнне зычных і яго адрозненне ад марфалагічнага падваення. Пераход *[в]* у *[ў]*, *[л]* у *[ў]*. Дзеканне і цеканне. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні зычных. Прыстаўныя зычныя гукі.

### Тэма 3. Склад. Тыпы складоў у беларускай мове. Складападзел. Асаблівасці беларускага націску

Склад. Паняцце складу, прынцыпы складападзелу. Тыпы складоў у беларускай мове.

Націск. Асаблівасці беларускага націску. Націск як сродак размежавання слоў і словаформаў. Пабочны націск. Лагічны і фразавы націск.

Такт, фраза, інтанацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 4. Фанетычная транскрыпцыя. Фанетычны аналіз слова**

*Практычныя заняткі.* 1. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. 2. Асаблівасці сістэмы вакалізму беларускай мовы. 3. Асаблівасці кансанантызму беларускай мовы. 4. Складападзел. 5. Спецыфіка беларускага націску. 6. Фанетычны аналіз слова і фанетычная транскрыпцыя.

*Самастойная работа.* Асаблівасці беларускага націску.

## Раздзел III
## АРФАЭПІЯ

**Тэма 5. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення і прычыны адхілення ад іх**

Прадмет, задачы і змест арфаэпіі. Звесткі з гісторыі беларускай арфаэпіі.

Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, іх спалучэнняў у словах іншамоўнага паходжання; вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных; вымаўленне некаторых граматычных формаў.

*Практычныя заняткі.* 1. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. 2. Асаблівасці вымаўлення галосных і зычных гукаў, спалучэнняў галосных і спалучэнняў зычных. 3. Прычыны адхілення ад беларускага літаратурнага вымаўлення.

*Самастойная работа.* Вымаўленне асобных словаформаў розных часцін мовы.

## Раздзел IV
## ГРАФІКА

**Тэма 6. Графіка як раздзел мовазнаўства. Суадносіны паміж гукамі і літарамі. Графічны аналіз**

Змест і задачы графікі. Беларускі алфавіт. Нялітарныя графічныя сродкі (націск, апостраф, злучок, пунктуацыйныя знакі і інш.).

Гукавы і складовы прынцып беларускай графікі. Адназначныя і мнагазначныя літары. З гісторыі беларускай графікі: тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства. Кірыліца як аснова беларускай графічнай сістэмы.

Графічны аналіз.

*Практычныя заняткі:* 1. Графіка як раздзел мовазнаўства. 2. Суадносіны літар і гукаў. 3. Прынцыпы беларускай графікі. 4. Звесткі з гісторыі беларускай графікі.

*Самастойная работа.* Тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства. Кітабы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V
## АРФАГРАФІЯ

### Тэма 7. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Прынцыпы беларускай арфаграфіі

Прадмет, задачы і змест арфаграфіі. Раздзелы арфаграфіі.

Звесткі з гісторыі арфаграфіі. "Беларуская граматыка для школ" Б.Тарашкевіча. Рэформа беларускай арфаграфіі (1933). Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу (1957). Закон аб мовах. Нормы правапісу паводле рэформы 2009 года.

Правілы, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Правілы, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе. Дыферэнцыяваныя і традыцыйныя напісанні ў сучаснай беларускай мове.

Недасканаласць некаторых правілаў сучаснага беларускага правапісу.

Паняцце арфаграмы. Арфаграфічны аналіз.

### Тэма 8. Ужыванне вялікай літары. Злітнае і паўзлітнае напісанне. Правапіс мяккага знака і апострафа

*Практычныя заняткі.* І. 1. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. 2. Раздзелы арфаграфіі. 3. Прынцыпы беларускай арфаграфіі. 4. Дыферэнцыяваныя і традыцыйныя напісанні ў сучаснай беларускай мове.

ІІ. 1. Напісанні паводле фанетычнага прынцыпу. 2. Напісанні паводле марфалагічнага прынцыпу. 3. Звесткі з гісторыі беларускай арфаграфіі.

ІІІ. 1. Ужыванне вялікай літары. 2. Злітнае і паўзлітнае напісанне. 3. Напісанне ўмоўных скарачэнняў. 4. Арфаграфічны аналіз.

*Самастойная работа.* Правапіс мяккага знака і апострафа. Ужыванне вялікай літары.

## Раздзел VI
## ЛЕКСІКАЛОГІЯ І ЛЕКСІКАГРАФІЯ

### Тэма 9. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Адназначныя і мнагазначныя словы. Аманімія ў мове

Паняцце пра лексіку. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

Слова як лексічная адзінка мовы. Слова і паняцце. Лексічнае і граматычнае значэнне слова. Тыпы лексічных значэнняў слова паводле спосабу намінацыі. Значэнні слоў паводле іх лексічнай спалучальнасці. Лексіка-семантычныя групы слоў.

Адназначныя (монасемантычныя) і мнагазначныя (полісемантычныя) словы. Асноўныя тыпы ўзнікнення пераносных значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха, іх тыпы і функцыі ў мове.

Амонімы. Адрозненне аманіміі і мнагазначнасці ў слоўніках. Лексічныя амонімы. Поўная і частковая (няпоўная) аманімія. Амаформы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Амафоны. Амографы. Шляхі ўзнікнення амонімаў. Выкарыстанне аманіміі ў мове.

**Тэма 10. Паранімія і паранамазія. Сінанімія. Антанімія**

Паронімы і іх ужыванне ў мове. Паранамазія.

Сінонімы. Разрады сінонімаў у залежнасці ад сэнсавых і стылёвых адрозненняў. Сінанімічны рад і дамінанта. Сувязь сінаніміі з мнагазначнасцю. Шляхі ўзнікнення сінонімаў. Эўфемізмы і дысфемізмы. Моўныя/узуальныя (семантычныя, стылістычныя, семантыка-стылістычныя, абсалютныя сінонімы, ці дублеты) сінонімы і сінонімы маўлення (кантэкстуальныя, аўтарскія). Функцыі сінонімаў у мове.

Антонімы. Рознакаранёвыя і аднакаранёвыя антонімы. Антонімы і мнагазначнасць слова. Энантыясемія і яе тыпы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (кантэкстуальныя антонімы, аксюмаран, антытэза).

**Тэма 11. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Актыўная і пасіўная лексіка**

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечна беларуская лексіка: агульнаславянская, усходнеславянская і ўласнабеларуская лексіка. Запазычаныя словы ў беларускай мове і іх прыметы. Семантычнае, фанетычнае і марфалагічнае асваенне запазычаных слоў. Варварызмы, экзатызмы і іх выкарыстанне ў мове.

Актыўная і пасіўная лексіка. Змены ў слоўнікавым складзе мовы. Актыўная лексіка. Пасіўная лексіка. Устарэлыя словы (архаізмы і іх віды, гістарызмы і іх лексіка-семантычныя групы) і іх ужыванне ў мове. Неалагізмы іх тыпы і функцыі.

**Тэма 12. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі**

Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжывання. Дыялектызмы і іх разнавіднасці. Спецыяльная лексіка: тэрміны і іх віды, прафесіяналізмы і іх віды. Стылістычнае выкарыстанне лексікі абмежаванага ўжытку ў мове. Жарганізмы ў мове, іх тыпы.

Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Стылістычна нейтральныя словы. Стылістычна афарбаваная лексіка: гутарковыя і кніжныя словы. Паняцце лексіка-стылістычнай парадыгмы.

Лексічны аналіз.

**Тэма 13. Беларуская лексікаграфія**

Прадмет і задачы лексікаграфіі. Энцыклапедычныя слоўнікі і іх тыпы. Тыпы лінгвістычных слоўнікаў (перакладныя, тлумачальныя, арфаграфічныя, арфаэпічныя, этымалагічныя, дыялектныя і інш. ). Асаблівасці слоўнікавага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артыкула ў лінгвістычных слоўніках (рэестравае слова і спосабы яго тлумачэння, граматычныя і стылістычныя паметы, ілюстрацыі і інш.).

З гісторыі беларускай лексікаграфіі: лексікаграфічная праца Л.Зізанія, П.Бярынды, І.Насовіча, Я.Ціхінскага і інш. Лексікаграфічная праца ў 20 – 30-я гады.

Слоўнікі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

VII. 1. Прадмет, задачы і змест лексікаграфіі. 2. Звесткі з гісторыі лексікаграфіі.

VIII. 1. Слоўнікі лінгвістычныя, іх тыпы. 2. Слоўнікі энцыклапедычныя, іх тыпы. 3. Асаблівасці структуры слоўнікавых артыкулаў.

*Практычныя заняткі*. І. 1. Прадмет, задачы і змест лексікалогіі. 2. Слова як лексічная адзінка мовы. 3. Адназначныя і мнагазначныя словы.

ІІ. 1. Амонімы. 2. Паронімы.

ІІІ. 1. Сінонімы. 2. Антонімы.

VІ. 1. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. 2. Актыўная і пасіўная лексіка.

V. 1. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. 2. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі.

*Лабараторныя заняткі.* 1. З’явы паранімії, сінанімії, антанімії ў мове. 2. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання: дыялектызмы, іх тыпы; прафесійная лексіка; тэрміны. 3. Нейтральная і стылістычна афарбаваная лексіка. 4. Тыпы слоўнікаў, будова слоўнікавага артыкула.

## Раздзел VII
## ФРАЗЕАЛОГІЯ І ФРАЗЕАГРАФІЯ

### Тэма 14. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Тыпы фразеалагізмаў

Прадмет фразеалогіі. Асноўныя асаблівасці фразеалагічных адзінак (адзінае, цэласнае значэнне; устойлівасць; узнаўляльнасць; сінтаксічная непадзельнасць; экспрэсіўнасць; вобразнасць). Варыянтнасць фразеалагічных адзінак. Мнагазначнасць/полісемантычнасць, сінанімічнасць, аманімічнасць, антанімічнасць фразем.

Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў (зрашчэнні/ідыёмы, адзінствы, спалучэнні, выразы), суаднесенасці з часцінамі мовы (дзеяслоўныя, назоўнікавыя, прыметнікавыя і інш.), паводле структуры (спалучэнні, словазлучэнні, сказы).

Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання: спрадвечна беларускія (агульнаславянскія, агульнаўсходнеславянскія, уласна беларускія) і запазычаныя фразеалагізмы.

Стылістычныя разрады фразеалагізмаў (міжстылёвыя, кніжныя, гутарковыя).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 15. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Беларуская фразеаграфія

Крыніцы беларускай фразеалогіі. Фразеалагізмы і пераклад. Фразеалогія ў шырокім значэнні слова.

## Раздзел VIII
## ГРАМАТЫКА. МАРФАЛОГІЯ

### Тэма 16. Граматыка як раздзел мовазнаўства

Прадмет, задачы і змест граматыкі. Марфалогія і сінтаксіс як састаўныя часткі граматыкі.

### Тэма 17. Словаўтварэнне як раздзел марфалогіі. Марфемная структура слова. Тыпы марфем

Прадмет, задачы і змест словаўтварэння. Марфеміка і дэрывацыя як састаўныя часткі словаўтварэння.

Марфемная структура слова. Тыпы марфем у залежнасці ад ролі ў слове, ад месца ў складзе слова, у залежнасці ад значэння, ад частотнасці ўжывання. Аснова слова і яе тыпы: невытворная і вытворная; суплетыўныя асновы. Канчатак і яго роля ў слове. Нулявыя канчаткі. Нулявыя марфемы.

### Тэма 18. Корань слова. Афіксоіды. Афіксы

Корань слова. Варыянты (фанетычныя разнавіднасці) кораня. Свабодныя і звязаныя карані. Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды).

Афіксы. Прыстаўка (прэфікс) і суфікс. Варыянты прыставак і суфіксаў. Словаўтваральныя і формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы. Сінкрэтычныя марфемы. Постфікс. Інтэрфікс. Конфікс. Уніфікс.

### Тэма 19. Змяненні ў марфемнай будове слова

Аманімія і мнагазначнасць марфем, іх семантычнае і функцыянальнае адрозненне. Сінанімія і варыянтнасць марфем. Антанімія марфем.

Змяненні ў марфемнай будове слова: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя і інш. Прычыны змянення будовы слова.

### Тэма 20. Тыпы і спосабы сучаснага словаўтварэння

Тыпы і спосабы сучаснага словаўтварэння. Марфалагічна-сінтаксічнае і семантычнае ўтварэнне новых слоў. Складанне і яго віды. Усячэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 21. Марфемны, словаўтваральны і этымалагічны аналіз будовы слова

*Практычныя заняткі:* І. 1. Прадмет, задачы і змест словаўтварэння. 2. Паняцце марфемікі і дэрывацыі.

ІІ. 1. Марфалагічная структура слова. 2. Тыпы марфем. 3. Аснова слова і яе тыпы. 4. Канчатак і яго роля ў слове. 5. Нулявыя марфемы.

ІІІ. 1. Корань слова і яго варыянты. 2. Свабодныя і звязаныя карані.

IV. 1. Паняцце афіксаў. 2. Прыстаўка і суфікс, іх варыянты і функцыя ў слове. 3. Сінкрэтычныя марфемы. 4. Іншыя віды марфем (постфікс, уніфікс і інш.). 3. Аналіз прычын змянення структуры слова.

V. 1. Змяненні ў марфалагічнай структуры слова. 2. Апрошчанне, перараскладанне і інш. 3. Аналіз прычын змянення структуры слова.

VI. 1. Паняцце словаўтварэння. 2. Тыпы і спосабы словаўтварэння.

VII. 1. Марфемны аналіз будовы слова. 2. Словаўтваральны аналіз структуры слова. 3. Этымалагічны аналіз будовы слова.

*Самастойная работа*. Тыпы марфем.

## Тэма 22. Марфалогія як граматычнае вучэнне аб словах і словаформах. Сістэма часцін мовы, прынцыпы іх класіфікацыі

Марфалогія, яе прадмет, задачы і змест. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Граматычная катэгорыя, граматычныя значэнні і формы. Паняцце словаформы. Парадыгма як сукупнасць граматычных формаў слова. Спосабы і сродкі выражэння граматычных катэгорый і значэнняў.

Часціны мовы. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Прынцыпы класіфікацыі часцін мовы. Сістэма часцін мовы. Агульная характарыстыка знамянальных (самастойных) і незнамянальных (службовых) часцін мовы. Месца мадальных слоў, звязкі, выклічніка ў сістэме часцін мовы.

## Тэма 23. Знамянальныя, або самастойныя, часціны мовы

Назоўнік. Назоўнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя, уласныя і агульныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя і неасабовыя, зборныя, адзінкавыя, рэчыўныя і іх граматычныя асаблівасці.

Граматычныя катэгорыі назоўнікаў. Катэгорыя роду назоўнікаў (мужчынскі, жаночы, ніякі, агульны род; вызначэнне роду назоўнікаў марфалагічным, сінтаксічным, семантычным спосабамі; род нескланяльных назоўнікаў іншамоўнага паходжання; род нескланяльных складанаскарочаных назоўнікаў; несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах).

Катэгорыя ліку назоўнікаў і яе граматычнае выражэнне. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі. Рэшткі парнага ліку ў сучаснай беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Катэгорыя склону назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў. Формы клічнага склону.

Сістэма скланення назоўнікаў. Тыпы скланення назоўнікаў. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў першага скланення. Назоўнікі другога скланення і іх канчаткі. Трэцяе скланенне назоўнікаў. Канчаткі рознаскланяльных назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Асаблівасці скланення ўласных назоўнікаў. Нескланяльныя назоўнікі.

Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі. Пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі (субстантывацыя).

Марфалагічны аналіз назоўнікаў.

Прыметнік. Прыметнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя, прыналежныя (уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя), пераходныя / прамежкавыя разрады прыметнікаў (адносна-прыналежныя, адносна-якасныя і прыналежна-адносныя).

Поўныя, кароткія і ўсечаныя формы прыметнікаў.

Скланенне прыметнікаў. Асаблівасці скланення прыметнікаў жаночага, мужчынскага і ніякага роду. Канчаткі прыметнікаў у множным ліку. Асаблівасці скланення прыналежных прыметнікаў.

Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступені параўнання. Суплетыўная форма вышэйшай ступені параўнання. Элятыўнае значэнне формы найвышэйшай ступені параўнання.

Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці (павелічальна-ўзмацняльныя, памяншальна-ласкальныя, непаўнаты і павышанай меры якасці), іх утварэнне і ўжыванне.

Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі (ад'ектывацыя).

Марфалагічны аналіз прыметнікаў.

Лічэбнік. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі, іх характарыстыка. Простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Асаблівасці скланення лічэбнікаў. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы. Няпэўна-колькасныя словы.

Марфалагічны аналіз лічэбнікаў.

Займеннік. Агульная характарыстыка займенніка як часціны мовы. Разрады займеннікаў (асабовыя, зваротныя, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя), іх лексіка-граматычная характарыстыка і скланенне. Групы займеннікаў паводле суаднесенасці з іншымі часцінамі мовы (абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя). Ужыванне іншых часцін мовы ў ролі займенніка (пранаміналізацыя).

Марфалагічны аналіз займеннікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеяслоў. Дзеяслоў як часціна мовы. Спрагальныя і неспрагальныя формы. Інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова), яго граматычныя катэгорыі і сінтаксічная роля. Асновы дзеяслова.

Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы (уласна-зваротныя, узаемна-зваротныя, агульна-зваротныя, ускосна-зваротныя, якасна-зваротныя), іх значэнне і ўтварэнне. Зваротныя дзеясловы, якія ўжываюцца толькі з –ся (reflexiva tantum).

Катэгорыя стану дзеясловаў. Пытанне пра станы дзеясловаў у лінгвістычнай літаратуры. Дзеясловы незалежнага і залежнага стану. Творны дзейнага прадмета (творны суб'екта) і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану. Аднастанавыя дзеясловы.

Катэгорыя трывання. Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання. Утварэнне суадносных пар трывання. Ступеннае ўтварэнне трывання. Аднатрывальныя і двухтрывальныя дзеясловы. Катэгорыя трывання ў дзеясловах руху. Спосабы дзеяслоўнага дзеяння.

Катэгорыя ладу. Паняцце катэгорыі ладу. Абвесны лад. Загадны лад, яго ўтварэнне і значэнне. Умоўны лад, утварэнне і значэнне. Узаемазамяняльнасць формаў ладу (ужыванне формаў загаднага і ўмоўнага ладу са значэннем іншых ладоў, ужыванне інфінітыва з пабуджальным значэннем і інш.).

Катэгорыя часу. Значэнне формаў часу. Абсалютны і адносны час. Цяперашні час і яго значэнне. Будучы час, формы будучага часу і іх значэнне. Прошлы час. Значэнні прошлага часу. Простая і складаная формы прошлаага часу. Узаемазамяняльнасць формаў часу (ужыванне цяперашняга часу са значэннем іншых часоў, ужыванне будучага часу са значэннем іншых часоў і г.д.).

Катэгорыя асобы. Асабовыя і безасабовыя дзеясловы. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці.

Спражэнне дзеясловаў. Канчаткі першага і другога спражэння дзеясловаў; вызначэнне спражэння па інфінітыве. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Марфалагічны аналіз інфінітыва і асабовых формаў дзеяслова.

Дзеепрыметнік. Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыметніка (катэгорыі стану, трывання, часу; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыметніка ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыметніка (катэгорыі роду, ліку, склону; сінтаксічныя функцыі). Поўная і кароткая форма дзеепрыметнікаў і іх сінтаксічная роля.

Утварэнне дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану.

Ужыванне дзеепрыметнікаў. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі. Неўласцівыя беларускай мове дзеепрыметныя формы і іх замена пры перакладзе.

Марфалагічны аналіз дзеепрыметнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеепрыслоўе. Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыслоўя (катэгорыі трывання, стану; зваротная форма; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыслоўяў ад дзеяслоўных асноў). Прыметы прыслоўя (нязменнасць, прымыканне да дзеяслова, сінтаксічныя функцыі). Адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі.

Утварэнне дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання.

Ужыванне дзеепрыслоўяў.

Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўяў.

Прыслоўе. Марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля прыслоўяў. Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя/уласна характэрызуючыя (якасныя, колькасныя, спосабу дзеяння) і акалічнасныя (прыслоўі месца, часу, прычыны, мэты). Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці.

Пераход іншых часцін мовы ў прыслоўі (адвербіялізацыя).

Марфалагічны аналіз прыслоўяў.

**Тэма 24. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы як асобая часціна мовы**

Безасабова-прэдыкатыўныя словы (катэгорыя стану). Агульная характарыстыка безасабова-прэдыкатыўных слоў (семантыка, ужыванне і ўтварэнне). Размежаванне безасабова-прэдыкатыўных слоў і аманімічных з імі прыслоўяў і кароткіх прыметнікаў.

Марфалагічны аналіз.

Мадальныя словы. Мадальнасць і сродкі яе выражэння. Характарыстыка мадальных слоў і іх семантычныя разрады. Суадноснасць мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы.

Марфалагічны аналіз.

*Практычныя заняткі.* I. 1. Асаблівасці скланення назоўнікаў I, II і III скланення. 2. Рознаскланяльныя назоўнікі. 3. Скланенне ўласных назоўнікаў. 4. Марфалагічны аналіз назоўніка.

II. 1. Асаблівасці скланення прыметнікаў розных разрадаў. 2. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. 3. Поўная і кароткая формы прыметніка. 4. Марфалагічны аналіз прыметніка.

III. 1. Скланенне лічэбнікаў. 2. Марфалагічны аналіз лічэбніка. 3. Разрады і скланенне займеннікаў. 3. Разрады і скланенне займенніка. 4. Марфалагічны аналіз займенніка.

IV. 1. Дзеяслоў як часціна мовы. 2. Катэгорыі дзеяслова. 3. Марфалагічны аналіз дзеяслова.

V. 1. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як спецыфічныя дзеяслоўныя формы. 2. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметніка. 3. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўя. 4. Марфалагічны аналіз дзеяслоўных формаў.

VI. 1. Прыслоўе як часціна мовы. 2. Разрады прыслоўяў. 3. Ступені параўнання якасных прыслоўяў. 4. Формы ацэнкі прыслоўяў. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Марфалагічны аналіз. 6. Агульная характарыстыка безасабова-прэдыкатыўных слоў.

VII. 1. Марфалагічны аналіз службовых часцін мовы: а) прыназоўніка; б) злучніка; в) часціцы; г) звязкі. 2. Марфалагічны аналіз мадальных слоў. 3. Марфалагічны аналіз выклічніка і гукапераймальных слоў.

*Самастойная работа.* 1. Сістэма часцін мовы, прынцыпы іх класіфікацыі. 2. Мадальныя словы як асобая часціна мовы.

### Тэма 25. Службовыя часціны мовы. Гукапераймальныя словы і выклічнікі

Прыназоўнік. Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Простыя, складаныя і састаўныя прыназоўнікі. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў са склонамі. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў.

Сінаніміка прыназоўнікаў.

Марфалагічны аналіз.

Злучнік. Злучнік як часціна мовы. Злучальныя (спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя, далучальныя і паясняльныя) злучнікі. Падпарадкавальныя (часавыя, прычынныя, мэтавыя, умоўныя, параўнальныя, уступальныя, тлумачальныя, выніковыя) злучнікі. Семантычныя і асемантычныя злучнікі. Класіфікацыя злучнікаў паводле іх паходжання, структуры і спосабу ўжывання. Адрозненне злучнікаў ад займеннікаў і прыслоўяў – адносных слоў.

Марфалагічны аналіз.

Часціца. Часціца як часціна мовы. Класіфікацыя часціц: а) паводле марфалагічнага складу (простыя, састаўныя); б) паводле паходжання (невытворныя і вытворныя); в) паводле значэння (часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні; мадальныя і мадальна-валявыя часціцы); г) паводле функцыі (словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы).

Марфалагічны аналіз.

Выклічнік. Агульная характарыстыка выклічнікаў: а) паводле значэння (эмацыянальныя, волевыяўленчыя, моўнага этыкету); б) паводле паходжання (вытворныя і невытворныя). Полісемантычнасць невытворных эмацыянальных выклічнікаў.

Марфалагічны аналіз.

Гукапераймальныя словы. Значэнне і ўжыванне гукапераймальных слоў, іх адрозненне ад выклічнікаў. Агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія гукаперайманні.

Марфалагічны аналіз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IX
## СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

### Тэма 26. Сінтаксіс як раздзел граматыкі. Словазлучэнне і яго тыпы

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы. Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Сказ і словазлучэнне як асноўныя аб'екты сінтаксісу. Граматычныя сродкі сінтаксісу.

Словазлучэнне. Словазлучэнне як сэнсава-граматычнае аб'яднанне паўназначных слоў. Свабодныя і сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні. Класіфікацыя словазлучэнняў: а) паводле граматычнага выражэння галоўнага слова (іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя); б) паводле сэнсавых адносін кампанентаў (аб'ектныя, азначальныя, акалічнасныя); в) паводле структуры (простыя і складаныя).

Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях: поўнае і няпоўнае дапасаванне, кіраванне і яго тыпы (прыдзеяслоўнае, прыйменнае, прыадвербіяльнае; прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае; слабае і моцнае), прымыканне.

Спецыфіка беларускага кіравання.

Сінтаксічны аналіз словазлучэння.

### Тэма 27. Сказ як сінтаксічная адзінка. Просты сказ. Галоўныя і даданыя члены сказа

Сказ як сінтаксічная адзінка. Асноўныя адзнакі сказа: прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая і інтанацыйная завершанасць, граматычная аформленасць. Адрозненне сказа ад словазлучэння і слова.

Тыпы сказаў паводле: а) мэты выказвання (апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя); б) адносінаў да рэчаіснасці (сцвярджальныя і адмоўныя); в) эмацыянальнай афарбоўкі (клічныя і няклічныя); г) наяўнасці галоўных членаў сказа (двухсастаўныя і аднасастаўныя); д) наяўнасці даданых членаў сказа (развітыя і неразвітыя). Поўныя і няпоўныя сказы. Эліптычныя сказы. Словы-сказы. Тыпы сказаў паводле структуры (простыя і складаныя).

Просты сказ. Двухсастаўны сказ.Граматычная аснова двухсастаўнага сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа.

Дзейнік і спосабы яго выражэння. Выказнік і яго тыпы. Звязкі, іх тыпы ў дзеяслоўным і іменным выказніку. Размежаванне дзейніка і выказніка, выражаных назоўнікамі назоўнага склону, інфінітывам. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў ліку і родзе.

Дапаўненне і яго віды (прамое, ускоснае прыйменнае, прыдзеяслоўнае, прыадвербіяльнае).

Азначэнне, яго віды (дапасаванае і недапасаванае) і граматычнае выражэнне. Прыдатак як асобны тып дапасаванага азначэння. Значэнні прыдатка. Адзіночны і развіты/разгорнуты прыдатак. Адрозненне прыдатка і адзіночнага паясняльнага назоўніка.

Акалічнасці. Віды акалічнасцей (месца, часу, прычыны і інш.) і спосабы іх выражэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Размежаванне даданых членаў сказа. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа.

### Тэма 28. Ускладнены сказ. Сінтаксічнае ўскладненне простага сказа

Ускладнены сказ. Сінтаксічнае ўскладненне простага сказа.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Спосабы выражэння параўнальных зваротаў. Адрозненне параўнальных зваротаў ад даданых параўнальных частак складаназалежнага сказа.

Сказы з аднароднымі членамі. Граматычнае выражэнне аднародных членаў сказа. Злучнікавая і бяззлучнікавая сувязь аднародных членаў сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасабленне ўдакладняльных членаў сказа.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, іх значэнне і функцыі ў сказе. Падабенства і адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.

Паняцце звароткa. Спосабы выражэння звароткa і яго месца ў сказе. Інтанацыйнае выдзяленне звароткa і знакі прыпынку пры ім. Адрозненне звароткаў ад вакатыўных сказаў.

### Тэма 29. Аднасастаўныя сказы і іх тыпы. Няпоўныя сказы

Аднасастаўныя сказы, іх структура і тыпы (пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя і намінатыўныя сказы). Вакатыўныя сказы. Назоўны ўяўлення. Адрозненне гэтых канструкцый ад намінатыўных сказаў і звароткa.

Няпоўныя сказы і іх тыпы (рэплікі дыялога, часткі складаных сказаў, кантэкстуальныя і сітуацыйныя сказы). Эліптычныя сказы і іх адрозненне ад намінатыўных і няпэўна-асабовых сказаў.

### Тэма 30. Камунікатыўная арганізацыя простага сказа

Камунікатыўная арганізацыя простага сказа. Актуальнае чляненне сказа. Паняцце тэмы і рэмы.

Парадак слоў у сказе і яго функцыі (граматычная, камунікатыўная, стылістычная).

Сінтаксічны аналіз простага сказа.

### Тэма 31. Складаны сказ

Складаны сказ. Структура складанага сказа, адрозненне яго ад простага сказа. Сродкі сувязі частак у складаным сказе. Тыпы складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя, складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі. Пераходныя выпадкі паміж злучэннем і падпарадкаваннем у складаным сказе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складаназлучаны сказ. Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа. Сувязь частак у складаназлучаным сказе пры дапамозе злучнікаў (спалучальных, супраціўных, размеркавальных і далучальных). Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаным сказе.

Складаназалежны сказ. Паняцце складаназалежнага сказа. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (зучнікі, злучальныя словы і інш.). Роля ўказальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў) у галоўнай частцы. Размежаванне злучнікаў і злучальных слоў.

Тыпы даданых частак складаназалежных сказаў: дзейнікавыя, выказнікавыя, дапаўняльныя, азначальныя, акалічнасныя і інш.

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі. Сузалежнае і паслядоўнае падпарадкаванне. Віды сузалежнага падпарадкавання (аднароднае і неаднароднае). Змешанае падпарадкаванне. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі.

Бяззлучнікавы складаны сказ. Агульная характарыстыка складанага сказа. Сродкі сувязі частак бяззлучнікавых сказаў. Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў бяззлучнікавых сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў.

Складаны сказ з рознымі відамі сувязі як сказ кантамінаванай структуры. Разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі. Сродкі сувязі частак і знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

Сінтаксічны аналіз складанага сказа.

### Тэма 32. Асноўныя адзінкі і структура звязнай мовы

Асноўныя адзінкі і структура звязнай мовы.

Перыяд, яго структура і сродкі сувязі частак. Знакі прыпынку ў перыядзе.

Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ), або звышфразавае адзінства (ЗА), як адна з формаў звязнай мовы. Сувязь сказаў (паслядоўная, кампазіцыйная і эмацыянальная).

Аналіз складаных формаў звязнай мовы.

### Тэма 33. Чужая мова і асноўныя спосабы яе перадачы

Чужая мова / чужаслоўе. Паняцце чужой мовы. Простая, няўласна-простая і ўскосная мова як асноўныя спосабы перадачы чужой мовы. Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы і сродкі іх сувязі. Разнавіднасці простай мовы (маналог, дыялог, палілог; уключаная простая мова). Няўласна-простая мова як адначленная канструкцыя, яе сінтаксічная і стылістычная роля.

Цытаты, іх афармленне і функцыі.

Аналіз сказа з чужой мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 34. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку

Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку. Сувязь пунктуацыі з сінтаксісам. Віды знакаў прыпынку: раздзяляльныя і выдзяляльныя. Спалучэнне знакаў прыпынку і "паглынанне" адных знакаў другімі.

Нарматыўныя знакі прыпынку. Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку. Аўтарскія знакі прыпынку.

Агляд асноўных правілаў пунктуацыі.

Паняцце пунктаграмы. Пунктуацыйны аналіз.

*Практычныя заняткі.* I. 1. Словазлучэнне як сэнсава-граматычнае аб'яднанне паўназначных слоў. 2. Класіфікацыя словазлучэнняў. 3. Віды сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні. 4. Сінтаксічны аналіз словазлучэння.

II. 1. Сказ як сінтаксічная адзінка. 2. Тыпы сказаў.

III. 1. Просты сказ. 2. Граматычная аснова сказа: дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння і сувязь.

IV. 1. Даданыя члены сказа і іх тыпы. 2. Размежаванне даданых членаў сказа. 3. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа.

V–VI. 1. Ускладнены сказ. 2. Сказы з параўнальнымі зваротамі. 3. Сказы з аднароднымі членамі сказа. 4. Сказы з адасобленымі членамі сказа. 5. Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы. 6. Сказы са звароткамі.

VII. 1. Аднасастаўныя сказы, іх структура і тыпы. 2. Адрозненне вакатыўных сказаў, назоўнага ўяўлення і звароткa ад сказаў аднасастаўных.

VIII. 1. Няпоўныя сказы і іх тыпы. 2. Камунікатыўная арганізацыя простага сказа. 3. Сінтаксічны аналіз простага сказа.

IX. 1. Складаны сказ, яго структура і сродкі сувязі частак. 2. Складаназлучаны сказ, сродкі сувязі і разнастайнасць сэнсавых адносін паміж часткамі.

X. 1. Складаназалежны сказ, сродкі сувязі частак. 2. Размежаванне злучнікаў і злучальных слоў. 3. Тыпы даданых частак. 4. Бяззлучнікавы складаны сказ.

XI. 1. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі. 2. Сінтаксчічны аналіз розных тыпаў сказа.

XII. 1. Асноўныя адзінкі і структура звязнай мовы: перыяд, ССЦ, абзац. 2. Аналіз складаных формаў звязнай мовы. 3. Паняцце чужой мовы. 4. Аналіз тэксту з чужой мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыказкі (прымаўкі), кампаратыўныя параўнанні. Крылатыя словы і афарызмы. Перыфраза і яе тыпы. Стылістычнае выкарыстанне фразеалогіі.

Фразеалагічны аналіз.

Прадмет і задачы фразеаграфіі. Слоўнікі ўласна фразеалагізмаў і іншыя слоўнікі ўстойлівых выразаў. Будова фразеалагічнага/фразеаграфічнага артыкула. Звесткі з гісторыі беларускай фразеаграфіі.

*Практычныя заняткі:* I. 1. Прадмет і задачы фразеалогіі. 2. Варыянтнасць фразеалагічных адзінак. 3. Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў.

II. 1. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання. 2. Стылістычныя разрады фразем. 3. Фразеалагічны аналіз.

III. 1. Прадмет, задачы і змест фразеаграфіі. 2. Фразеалагічныя тыпы слоўнікаў. 3. Будова фразеалагічнага артыкула.

*Лабараторныя заняткі:* Фразеалогія ў вузкім і ў шырокім сэнсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН для студэнтаў ФТБКіСМ (Літаратурная работа)**

| Раздзел і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекц. | Практ. |
| Тэма 1. Уводзіны. Прадмет, задачы і змест курса | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Фанетыка** | | | |
| Тэма 2. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Сістэма вакалізму ў беларускай мове | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 3. Сістэма кансанантызму ў беларускай мове | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 4. Склад. Тыпы складоў у беларускай мове. Прасадычныя фанетычныя адзінкі | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 5. Фанетычная транскрыпцыя. Фанетычныя сродкі выразнасці мовы | 3 | 1 | 2 |
| **Раздзел II. Арфаэпія** | | | |
| Тэма 6. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Нормы беларускага літаратурнага вымаўлення | 5 | 1 | 4 |
| **Раздзел III. Графіка** | | | |
| Тэма 7. Графіка як раздзел мовазнаўства | 3 | 1 | 2 |
| **Раздзел IV. Арфаграфія** | | | |
| Тэма 8. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 9. Прынцыпы беларускай арфаграфіі | **7** | 1 | 6 |
| **Раздзел V. Лексікалогія і лексікаграфія** | | | |
| Тэма 10. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 11. Адназначныя і мнагазначныя словы. Аманімія ў мове | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 12. Паранімія, сінанімія, антанімія і стылістычныя прыёмы, заснаваныя на гэтых моўных з’явах | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 13. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 14. Актыўная і пасіўная лексіка і яе роля ў стылі мастацкай літаратуры | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 15. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання і яе стылістычнае выкарыстанне | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 16. Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Роля стылістычна афарбаваных слоў у мове | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 17. Беларуская лексікаграфія | 2 | | 2 |
| **Раздзел VI. Фразеалогія і фразеаграфія** | | | |
| Тэма 18. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Сістэмныя адносіны ў фразеалогіі | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 19. Класіфікацыя фразеалагізмаў паводле паходжання і паводле стылістычнай афарбаванасці | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 20. Фразеалогія ў шырокім значэнні слова. Стылістычнае выкарыстанне ўстойлівых выразаў | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 21. Беларуская фразеаграфія | 2 | | 2 |
| **Раздзел VII. Граматыка. Марфалогія** | | | |
| Тэма 22. Граматыка як раздзел мовазнаўства | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 23. Марфалогія як раздзел граматыкі | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 24. Марфеміка як сістэма марфем мовы | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 25. Змены ў марфемнай структуры слова | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 26. Афіксоіды як марфемы пераходнага тыпу | 1 | 1 | |
| Тэма 27. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства | 6 | 2 | 4 |
| Тэма 28. Семантычная, лексіка-граматычная, слова- і формаўтваральная і стылістычная адметнасць назоўніка | 8 | 2 | 6 |
| Тэма 29. Семантычная, граматычная, форма- і словаўтваральная, стылістычная характарыстыкі прыметніка | 6 | 2 | 4 |
| Тэма 30. Семантыка-граматычная, структурная і стылістычная адметнасць лічэбніка | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 31. Семантычная, граматычная, стылістычная характарыстыка займенніка | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 32. Семантыка-граматычная, словаўтваральная і стылістычная адметнасць дзеяслова | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 33. Семантыка-граматычная і стылістычная адметнасць формаў дзеяслова | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 34. Семантычная, граматычная, слова- і формаўтваральная, стылістычная адметнасць прыслоўя | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 35. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы як асобая часціна мовы | 5 | 1 | 4 |
| Тэма 36. Сістэма службовых часцін мовы. Гукапераймальныя словы і выклічнікі | 8 | 2 | 6 |
| **Раздзел VIII. Сінтаксіс. Пунктуацыя** | | | |
| Тэма 37. Сінтаксіс як раздзел граматыкі. Словазлучэнне і яго тыпы | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 38. Сказ як сінтаксічная адзінка. Просты сказ. Галоўныя і даданыя члены сказа | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 39. Аднасастаўныя сказы і іх тыпы. Няпоўныя сказы. Бессастаўныя сказы | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 40. Сінтаксічнае ўскладненне простага сказа | 6 | 3 | 3 |
| Тэма 41. Камунікатыўная арганізацыя і стылістыка простага сказа | 2 | 1 | 1 |
| Тэма 42. Складаны сказ як поліпрэдыкатыўная адзінка | 10 | 2 | 8 |
| Тэма 43. Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ). Перыяд. Асаблівыя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 44. Чужая мова і асноўныя спосабы яе перадачы | 3 | 1 | 2 |
| Тэма 45. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку | 3 | 1 | 2 |
| **УСЯГО** | 172 | 52 | 120 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## УВОДЗІНЫ

### Тэма 1. Прадмет, задачы і змест курса

Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі. Беларускія пісьменнікі пра родную мову. Беларуская мова сярод моў свету. Паходжанне беларускай мовы, гістарычныя ўмовы яе развіцця.

Сучасная літаратурная мова, яе вусная і пісьмовая формы. Унармаванасць і кадыфікаванасць літаратурнай мовы. Функцыянальныя стылі, узровень іх развіцця на сучасным этапе.

Мова як сродак камунікацыі і інструмент пазнання рэчаіснасці. Камунікацыйныя якасці маўлення і іх тыпы. Сучасная літаратурная мова як прадмет вывучэння ў вышэйшай школе. Крыніцы вывучэння сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Структура курса традыцыйна складаецца з Уводзінаў, Фанетыкі, Арфаэпіі, Графіку, Арфаграфіі, Лексікалогіі і Лексікаграфіі, Фразеалогіі і Фразеаграфіі, Марфемікі і Словаўтварэння, Граматыкі (Марфалогія і Сінтаксіс), Пунктуацыі. На вывучэнне названых раздзелаў адводзіцца 336 гадзін і ў якасці форма кантролю – 2 экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел І

## Фанетыка

### Тэма 2. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Сістэма вакалізму ў беларускай мове

Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы. Прадмет фанетыкі. Метады вывучэння гукавога ладу мовы. Сувязь фанетыкі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (арфаэпіяй, графікай, арфаграфіяй і інш.).

Сістэма вакалізму. Паняцце галосных гукаў. Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных гукаў. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Моцная і слабая пазіцыя галосных гукаў. Пазіцыйныя змяненні галосных. Гістарычныя чаргаванні галосных гукаў. Прыстаўныя і ўстаўныя галосныя.

### Тэма 3. Сістэма кансанантызму ў беларускай мове

Сістэма кансанантызму. Паняцце зычных гукаў. Артыкуляцыйная класіфікацыя зычных і падзел зычных на групы паводле ўдзелу голасу і шуму, месца і спосабу ўтварэння, адсутнасці ці наяўнасці палаталізацыі. Няпарныя глухія-звонкія, цвёрдыя-мяккія гукі. Зацвярдзелыя гукі.

Пазіцыйныя змены і гістарычныя чаргаванні зычных гукаў. Асіміляцыя і дысіміляцыя. Фанетычнае падаўжэнне і марфалагічнае падваенне. Прыстаўныя зычныя гукі.

**Тэма 4. Склад. Тыпы складоў у беларускай мове. Прасадычныя фанетычныя адзінкі**

Склад як фанетычная адзінка. Суадносіны паміж складам і марфемай. Прынцыпы складападзелу. Тыпы складоў: аднакампанентныя і шматкампанентныя, адкрытыя і закрытыя, прыкрытыя і непрыкрытыя.

Прасадычныя фанетычныя адзінкі (націск, інтанацыя, фраза, такт) і іх роля ў арганізацыі моўнай плыні.

Фанетычная прырода націску. Асаблівасці беларускага націску. Функцыі лагічнага, эмфатычнага націску. Інтанацыя і яе кампаненты. Камунікацыйная, вылучальная, арганізуючая і эмацыянальная функцыі інтанацыі. Фразы, маўленчыя такты і фанетычныя словы як сродкі гукавой арганізацыі мовы.

**Тэма 5. Фанетычная транскрыпцыя. Фанетычныя сродкі выразнасці мовы**

Фанетычная транскрыпцыя як спецыяльнае фанетычнае пісьмо. Асноўныя правілы транскрыпцыі. Фанетычныя сродкі выразнасці мовы: алітэрацыя, асананс, гукавобраз, складападзел, даўжыня радка, анаматапея. Роля інтанацыі ў вусным маўленні, у мастацкім стылі (у празаічным, драматургічным, паэтычным падстылях).

## Раздзел II
## Арфаэпія

**Тэма 6. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Нормы беларускага літаратурнага вымаўлення**

Прадмет, задачы і змест арфаэпіі. Звесткі з гісторыі беларускай арфаэпіі. Практычнае значэнне арфаэпіі. Асноўныя нормы сучаснага беларускага літаратурнага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне спалучэнняў галосных, вымаўленне зычных у моцных і слабых пазіцыях, вымаўленне спалучэнняў зычных. Правілы вымаўлення гукаў на стыку марфем і на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Лінгвістычны аналіз адхіленняў ад нормаў літаратурнага вымаўлення ў сучаснай беларускай літаратурнай мове і ў мове мастацкай літаратуры.

## Раздзел III
## Графіка

**Тэма 7. Графіка як раздзел мовазнаўства**

Прадмет, задачы і змест графікі. Графічная сістэма сучаснай беларускай мовы: літарныя і нялітарныя графічныя сродкі. Алфавіт як аснова графікі. Суадносіны паміж гукамі і літарамі. Прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя лтары.

Звесткі з гісторыі беларускага пісьменства. Стылістычнае выкарыстанне графічных сродкаў мовы ў мастацкім тэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV
## Арфаграфія
### Тэма 8. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства

Змест і задачы арфаграфіі. Раздзелы арфаграфіі. Арфаграма і апорнае напісанне. Звесткі з гісторыі фарміравання беларускай арфаграфіі.

### Тэма 9. Прынцыпы беларускай арфаграфіі

Правілы, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Правілы, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе. Дыферэнцыяваныя і традыцыйныя напісанні ў сучаснай беларускай мове. Недасканаласць некаторых правілаў сучаснага беларускага правапісу.

Ужыванне вялікай літары. Напісанне слоў разам, праз злучок і асобна. Напісанне ўмоўных скарачэнняў.

Версіфікацыйныя адхіленні ў мастацкім тэксце.

## Раздзел V
## Лексікалогія і лексікаграфія
### Тэма 10. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства

Паняцце пра лексіку. Прадмет, задачы і змест лексікалогіі. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

Слова як асноўная адзінка мовы. Абагульняльны характар слова. Слова і паняцце. Лексічнае і граматычнае значэнні слова, іх узаемаабумоўленасць. Тыпы лексічных значэнняў слова паводле спосабу намінацыі, паводле іх лексічнай спалучальнасці і г. д. Парушэнне лексічнай спалучальнасці як памылка і як стылістычны прыём.

### Тэма 11. Адназначныя і мнагазначныя словы. Аманімія ў мове

Адназначныя (монасемантычныя) словы. Сутнасць полісеміі. Семантычная структура мнагазначнага слова. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха, іх тыпы і функцыя ў мове.

Сутнасць аманіміі. Структурныя тыпы амонімаў. Поўная і няпоўная (частковая) аманімія. Прычыны ўзнікнення амонімаў. Спосабы размежавання аманіміі і мнагазначнасці. Міжмоўная аманімія.

Выкарыстанне ў мове розных тыпаў метафарычных значэнняў слова: метафары, метаніміі, сінекдахі. Паняцці ўвасаблення і персаніфікацыі. Амонімы як сродак стварэння дакладнай рыфмы, каламбураў.

### Тэма 12. Паранімія, сінанімія, антанімія і стылістычныя прыёмы, заснаваныя на гэтых моўных з’явах

З’ява параніміі ў мове. Паронімы і ўмовы іх узнікнення. Паранімія і паранамазія.

Сінанімія. Класіфікацыя сінонімаў у залежнасці ад сэнсавых і стылёвых адрозненняў. Сінанімічны рад і дамінанта. Эўфемізмы і дысфемізмы ў сінанімічным радзе. Сувязь сінаніміі з мнагазначнасцю. Шляхі ўзнікнення сінонімаў. Моўныя (узуальныя) сінонімы і сінонімы маўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(кантэкстуальныя, або аўтарскія). Функцыі сінонімаў: удакладненне, замяшчэнне, ацэнка. Ампліфікацыя сінонімаў у мастацкім кантэксце.

Антанімія. Структурная і семантычная класіфікацыя антонімаў. Кантэкстуальныя антонімы. Антанімія і мнагазначнасць слова. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (аксюмаран, антытэза і інш.).

### Тэма 13. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання

Паняцце спрадвечна беларускай лексікі. Агульнаславянскія, усходнеславянскія і ўласнабеларускія словы і іх лексіка-семантычныя групы.

Запазычаныя словы ў беларускай мове і іх прыметы: запазычанні са славянскіх і неславянскіх моў. Семантычнае, фанетычнае і марфалагічнае асваенне запазычаных слоў.

Выкарыстанне ў мастацкім стылі спрадвечна беларускіх і запазычаных слоў. Стылістычная функцыя варварызмаў і экзатызмаў.

### Тэма 14. Актыўная і пасіўная лексіка і яе роля ў стылі мастацкай літаратуры

Паняцце актыўнай і пасіўнай лексікі. Змены ў слоўнікавым складзе мовы ў выніку наяўнасці / адсутнасці гістарычнай перспектывы. Устарэлыя словы: архаізмы і іх віды, гістарызмы і іх лексіка-семантычныя групы. Агульнаўжывальныя неалагізмы, іх віды; аўтарскія (аказіянальныя, або індывідуальна-стылістычныя) неалагізмы.

Стылістычная роля актыўнай і пасіўнай лексікі ў функцыянальных стылях.

### Тэма 15. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання і яе стылістычнае выкарыстанне

Паняцце агульнаўжывальнай лексікі і лексікі абмежаванага ўжывання. Дыялектызмы і іх разнавіднасці. Спецыяльная лексіка: тэрміны і іх віды, прафесіяналізмы. Жарганізмы і іх віды. Арго. Роля лексікі абмежаванага ўжытку ў мастацкім стылі.

Стылістычная характарыстыка лексікі абмежаванага ўжытку.

### Тэма 16. Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Роля стылістычна афарбаваных слоў у мове

Стылістычнае размежаванне лексікі беларускай мовы. Характарыстыка нейтральных слоў. Стылістычна афарбаваная лексіка: гутарковыя і кніжныя словы. Сістэма стылістычных памет ў слоўніках. Паняцце лексіка-стылістычнай парадыгмы. Прастамоўе як асобная група слоў у мове.

Стылістычнае выкарыстанне нейтральных слоў, паэтызмаў, газетызмаў, народна-паэтычных слоў і інш. у функцыянальных стылях.

### Тэма 17. Беларуская лексікаграфія

Прадмет, задачы і змест лексікаграфіі. Энцыклапедычныя даведнікі (агульныя і прадметныя). Тыпы лінгвістычных слоўнікаў (перакладныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тлумачальныя, арфаграфічныя, арфаэпічныя, этымалагічныя, дыялектныя і інш.). Асаблівасці слоўнікавага артыкула ў лінгвістычных слоўніках (рэестравае слова і спосабы яго тлумачэння, граматычны, фанетычны і стылістычны каментарый да слова, ілюстрацыі і інш.).

Звесткі з гісторыі беларускай лексікаграфіі: даслоўнікавы перыяд, лексікаграфічная праца Л.Зізанія, П.Бярынды, І.Насовіча, Я.Ціхінскага і інш. Лексікаграфічная праца ў 20 - 30-я гады.

Лексікаграфічная праца на сучасным этапе развіцця мовы.

## Раздзел VI

## Фразеалогія і фразеаграфія

### Тэма 18. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Сістэмныя адносіны ў фразеалогіі

Прадмет, задачы і змест фразеалогіі. Адрозненне слова і фразеалагізма, спалучэнняў слоў і фразеалагізма, сказаў і фразеалагізмаў. Асноўныя асаблівасці фразеалагічных адзінак (узнаўляльнасць, кампанентны склад, структурная ўстойлівасць, цэласнасць семантыкі).

Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў (зрашчэнні/ідыёмы, адзінствы, спалучэнні, выразы), паводле суаднесенасці з часцінамі мовы (субстантыўныя, дзеяслоўныя, ад’ектыўныя, прыслоўныя, мадальныя, выклічнікавыя фраземы), паводле структуры (фразеалагізмы, адпаведныя сказу; адпаведныя словазлучэнням; адпаведныя спалучэнню слоў; нерэгулярных мадэляў). Варыянтнасць фразеалагізмаў.

### Тэма 19. Класіфікацыя фразеалагізмаў паводле паходжання і паводле стылістычнай афарбаванасці

Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання: уласнабеларускія фраземы і запазычаныя. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Фразеалагічныя калькі і паўкалькі ў беларускай мове.

Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў: міжстылёвыя, кніжныя і размоўныя ўстойлівыя выразы і сфера іх ужывання. Сінанімія, антанімія, аманімія і мнагазначнасць фразеалагізмаў у беларускай мове.

### Тэма 20. Фразеалогія ў шырокім значэнні слова. Стылістычнае выкарыстанне ўстойлівых выразаў

Паняцце фразеалогіі ў шырокім сэнсе слова. Прыказкі (прымаўкі), кампаратыўныя фразеалагізмы. Крылатыя словы. Перыфраза і яе тыпы.

Фразеалагізмы і пераклад. Крытэрый літаральнай неперакладнасці ўстойлівых выразаў як паказчык нацыянальнай адметнасці мовы. Спосабы стылістычнага выкарыстання фразеалагізмаў, іх station акказіянальная і ўзуальная функцыя ў мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 21. Беларуская фразеаграфія

Прадмет і задачы фразеаграфіі. Тыпы фразеалагічных слоўнікаў. Будова фразеалагічнага/фразеаграфічнага артыкула. Звесткі з гісторыі беларускай фразеаграфіі.

## Раздзел VII
## Граматыка. Марфалогія

### Тэма 22. Граматыка як раздзел мовазнаўства

Прадмет, задачы і змест граматыкі. Марфалогія і сінтаксіс як састаўныя часткі граматыкі.

### Тэма 23. Марфалогія як раздзел граматыкі

Марфалогія, яе прадмет і задачы. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі: граматычная форма, граматычнае значэнне, граматычная катэгорыя і інш. Парадыгма як сукупнасць граматычных формаў слова. Спосабы і сродкі выражэння граматычных катэгорый і значэнняў.

Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Спрэчныя пытанні класіфікацыі часцін мовы. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы. Агульная характарыстыка знамянальных (самастойных) і незнамянальных (службовых) часцін мовы. Месца выклічнікаў, гукапераймальных слоў у сістэме часцін мовы.

### Тэма 24. Марфеміка як сістэма марфем мовы

Марфема як мінімальна значымая частка слоў і формаў. Суадносіны марфем з адзінкамі розных узроўняў мовы (з гукамі і складамі, са словамі, са словазлучэннямі і сказамі) з мэтай выяўлення іх адметных (дыферэнцыяльных) прымет. Сістэма марфем у мове. Класафікацыя марфем паводле іх ролі, значэння, функцыі і месца ў складзе слова. Адрозненне каранёвых і афіксальных марфем. Свабодныя і звязаныя карані. Паняцце афікса. Класіфікацыя афіксальных марфем адносна кораня (прэфікс, суфікс, постфікс, інтэрфікс, цыркумфікс, флексія). Класіфікацыя афіксальных марфем паводле значэння і функцыі (дэрывацыйныя, формаўтваральныя, рэляцыйныя, сінтэтычныя афіксы). Суадносіны рэгулярных і нерэгулярных, прадуктыўных і непрадуктыўных марфем. Тыпы афіксальных марфем паводле фанемнага выражэння (матэрыяльна выражаныя і нулявыя марфемы). Адзінкавыя структурныя часткі слоў – уніфіксы.

Аснова як абавязковы кампанент структуры слова, суадносіны асновы і кораня. Тыпы асноў (чляніміыя і нечлянімыя, вытворныя і невытворныя асновы; перарывістыя і неперарывістыя асновы, суплетыўны тып асноў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 25. Змены ў марфемнай структуры слова

Прычыны і характар гістарычных змен у марфемнай структуры слоў. Тыпы змен марфемнай будовы: апрошчанне (поўнае і няпоўнае), ускладненне, дэкарэляцыя, замяшчэнне, дыфузія, фузія, гаплалогія.

### Тэма 26. Афіксоіды як марфемы пераходнага тыпу

Паняцце афіксоідаў. Разнавіднасці афіксоідаў: прэфіксоіды, суфіксоіды. Пытанне пра афіксоіды ў сучаснай лінгвістыцы.

Структурна-семантычная характарыстыка афіксальных і каранёвай марфем (аманімія, полісемія, сінанімія і антанімія марфем).

Экспрэсіўна-стылістычныя функцыі марфем у беларускай мове.

### Тэма 27. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства

Прадмет, задачы і месца словаўтварэння сярод іншых лінгвістычных дысцыплін. Сінхранія і дыяхранія ў словаўтварэнні. Асноўныя словаўтваральныя паняцці: вытворнае (матываванае) і невытворнае (нематываванае) слова; утваральнае (матывавальнае) слова; словаўтваральная (матывавальная) база, словаўтваральны сродак (фармант), словаўтваральнае значэнне, словаўтваральнае гняздо, словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральны тып, словаўтваральная парадыгма, спосаб словаўтварэння.

Спосабы сінхроннага / сінхранічнага словаўтварэння, іх класіфікацыя (афіксацыя і складанне). Спосабы дыяхроннага / дыяхранічнага словаўтварэння (марфолага-сінтаксічны; лексіка-семантычны; лексіка-сінтаксічны).

Марфемнае словаўтварэнне: прэфіксальны спосаб; суфіксальны спосаб і нульсуфіксацыя; прэфіксальна-суфіксальны і прэфіксальна-нульсуфіксальны спосаб; постфіксальны спосаб, прэфіксальна-постфіксальны спосаб, суфіксальна-постфіксальны спосаб, прэфіксальна-суфіксальна-постфіксальны спосаб. Складанне як спосаб словаўтварэння і яго фармальна-структурныя разнавіднасці (складанне / чыстае складанне; асноваскладанне; складана-суфіксальны і складана-нульсуфіксальны спосаб; абрэвіяцыя і яе разнавіднасці: ініцыяльныя, складовыя, устаўныя / тэлескапічныя, змешаныя абрэвіятуры). Разнавіднасці марфалагічна-сінтаксічнага словаўтварэння: субстантывацыя, ад’ектывацыя, адвербіялізацыя, пранаміналізацыя, прэпазіцыяналізацыя і інш.

Паняцце словаўтваральнай нормы. Словаўтваральная варыянтнасць. Актыўныя працэсы ў сістэме сучаснага беларускага словаўтварэння. Індывідуальна-аўтарская словатворчасць і яе месца ў кантэксце мовы беларускай літаратуры і сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 28. Семантычная, лексіка-граматычная, слова- і формаўтваральная і стылістычная адметнасць назоўніка

Семантыка назоўніка. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: назоўнікі агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя і неасабовыя, зборныя, рэчыўныя, адзінкавыя.

Сістэма граматычных катэгорый назоўніка: катэгорыі роду, ліку і склону. Катэгорыя роду назоўнікаў. Значэнне і сродкі выражэння граматычных значэнняў мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Пытанне аб назоўніках агульнага роду. Граматычны род абрэвіятур як асобага тыпу назоўнікаў. Род нескланяльных іншамоўных назоўнікаў. Разыходжанні ў граматычным родзе некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Катэгорыя ліку назоўнікаў і яе граматычнае выражэнне. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі. Рэшткі парнага ліку ў сучаснай беларускай мове. Несупадзенне ў граматычным ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Катэгорыя склону назоўнікаў. Сістэма склонаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Асноўныя значэнні склонаў. Рэшткі формы клічнага склону.

Сістэма скланення назоўнікаў. Назоўнікі I, II і III скланенняў, рознаскланяльныя і нескланяльныя (нулявы тып скланення) назоўнікі, ад’ектыўны тып скланення. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў у множным ліку. Адметнасць скланення ўласных назоўнікаў, у тым ліку прозвішчаў. Варыянты склонавых канчаткаў.

Асноўныя спосабы і сродкі ўтварэння назоўнікаў. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі. Выкарыстанне назоўнікаў і іх склонавых формаў у тэкстах розных стыляў.

Назоўнік як сродак стварэння мастацкай выразнасці тэксту. Назоўнікавая метафара. Назоўнік як сродак стварэння статычных малюнкаў. Прозвішчы, мянушкі, імёны як гаваркія словы ў драматургічным кантэксце. Антанамасія. Сінекдаха. Эпітэт-прыдатак. Субстантыўныя параўнанні. Творны параўнання.

## Тэма 29. Семантычная, граматычная, форма- і словаўтваральная, стылістычная характарыстыкі прыметніка

Прыметнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя, прыналежныя прыметнікі, іх значэнне і формы. Утварэнне якасных прыметнікаў. Поўныя і кароткія формы якасных прыметнікаў, іх сінтаксічная роля і ўжыванне ў мове. Сцягнутыя формы прыметнікаў і іх функцыя ў стылі мастацкай літаратуры. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх простыя і складаныя формы. Суплетыўная форма вышэйшай ступені параўнання. Элятыўнае значэнне формы найвышэйшай ступені параўнання. Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці, іх утварэнне і ўжыванне. Асаблівасці ўтварэння адносных прыметнікаў і іх роля ў мове. Адметнасць утварэння і ўжывання прыналежных прыметнікаў. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Варыянтнасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

склонавых канчаткаў прыметнікаў. Выкарыстанне прыметніка ў ролі сродку слоўнага жывапісу мастацкага стылю. Прыёмы канцэнтрацыі і ампліфікацыі прыметнікаў. Прыметнік у ролі метафарычнага, злітнага і інш. відаў эпітэтаў. Ад’ектыўнае параўнанне.

Прыметнік як сродак інфармацыйнай, класіфікацыйнай характарыстыкі прадметаў.

### Тэма 30. Семантыка-граматычная, структурная і стылістычная адметнасць лічэбніка

Лічэбнік як часціна мовы. Семантычныя асаблівасці і адметнасць граматычных катэгорый лічэбнікаў. Разрады лічэбнікаў паводле значэння (колькасныя – уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя і парадкавыя лічэбнікі) і структуры (простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі). Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў. Утварэнне лічэбнікаў розных разрадаў. Ужыванне лічэбніка ў ролі іншых часцін мовы. Няпэўна-колькасныя словы.

Адметнасць ужывання лічэбніка з назоўнікамі. Дакладна-інфармацыйная роля лічэбніка ў тэкстах розных стыляў. Лічэбнік у мастацкім стылі: колькасная гіпербала, лічэбнік у складзе фразеалагізмаў і прыказак. Сімвалічны змест лічэбніка ў фальклоры.

### Тэма 31. Семантычная, граматычная, структурная і стылістычная характарыстыка займенніка

Займеннік як часціна мовы. Семантычная класіфікацыя займеннікаў: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя/неазначальныя). Марфалагічная класіфікацыя займеннікаў: разрады паводле суаднесенасці з іншымі іменнымі часцінамі мовы: займеннікі-назоўнікі, займеннікі-прыметнікі, займеннікі-лічэбнікі; іншыя віды суаднесенасці займеннікаў розных разрадаў з часцінамі мовы. Скланенне займеннікаў розных разрадаў. Варыянты склонавых формаў займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Роля пранаміналізацыі ва ўтварэнні займеннікаў.

Займеннік у якасці сродку лагічнай і сінтаксічнай арганізацыі тэксту. Роля займенніка ў мастацкім стылі: паўторы займенніка, займеннік у структуры фраземы і прыказкі, узаемазамяняльнасць займеннікавых формаў.

### Тэма 32. Семантыка-граматычная, словаўтваральная і стылістычная адметнасць дзеяслова

Дзеяслоў як часціна мовы. Асаблівасці семантыкі і граматычная адметнасць дзеяслова. Граматычныя катэгорыі і формы дзеяслова. Інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова), яе ўтварэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічная роля. Асновы дзеяслова: аснова інфінітыва і аснова цяперашняга (будучага простага) часу. Класы дзеясловаў: прадуктыўныя і непрадуктыўныя. Пераходныя і непераходныя дзеясловы, асаблівасці іх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

семантыкі, спалучэння са склонавымі формамі назоўніка. Зваротныя дзеясловы, іх значэнне, утварэнне і разрады (уласна-зваротныя, узаемна-зваротныя, агульна-зваротныя, ускосна-зваротныя, якасна-зваротныя) і іх утварэнне. Зваротныя дзеясловы, якія ўжываюцца толькі з –ца/–ся (reflexia tantum). Катэгорыя стану дзеясловаў. Пытанне пра стан дзеяслова ў сучаснай лінгвістыцы. Незалежны і залежны стан. Творны дзейнага прадмета (творны суб'екта) і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану. Аднастанавыя дзеясловы. Катэгорыя трывання. Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання, іх лексіка-граматычныя асаблівасці. Спосабы ўтварэння трывальных пар. Ступеннае ўтварэнне трывання. Аднатрывальныя і двухтрывальныя дзеясловы. Катэгорыя трывання ў дзеясловах руху. Спосабы дзеяслоўнага дзеяння. Катэгорыя ладу дзеясловаў. Граматычнае значэнне абвеснага ладу, яго формы і асаблівасці ўжывання. Загадны лад, яго значэнне, утварэнне і ўжыванне. Варыянты граматычных формаў загаднага ладу. Умоўны лад дзеяслова і яго граматычнае значэнне. Спосабы ўтварэння формаў умоўнага ладу. Катэгорыя часу дзеяслова. Значэнне формаў часу. Абсалютны і адносны час. Формы цяперашняга, прошлага і будучага часу. Утварэнне і ўжыванне формаў даўно мінулага часу. Катэгорыі роду і ліку дзеясловаў, іх формы і спецыфіка функцыянавання ў сістэме формаў ладу і часу. Суадноснасць катэгорыі роду і катэгорыі асобы дзеяслова. Катэгорыя асобы. Асабовыя і безасабовыя дзеясловы. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне. Безасабовыя дзеясловы, іх значэнне, граматычныя формы і ўжыванне. Спражэнне дзеясловаў. Сістэма асабовых канчаткаў дзеясловаў першага і другога спражэння. Спосабы вызначэння спражэнняў дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Сэнсавая і выяўленчая роля дзеяслова ў тэкстах розных стыляў. Узаемазамяняльнасць дзеяслоўных формаў: ужыванне формаў аднаго ладу ў значэнні другога. Выкарыстанне ў мове формаў адной асобы ў значэнні другой. Дзеяслоў як сродак стварэння выразнасці мастацкага тэксту: дзеяслоўная метафара, адвербіяльнае параўнанне, паўтор дзеясловаў з мэтай адлюстравання інтэнсіўнасці дзеяння, ампліфікацыя сінанімічных і несінанімічных дзеясловаў. Дзеяслоаў як сродак стварэння дынамічных малюнкаў.

### Тэма 33. Семантыка-граматычная і стылістычная адметнасць формаў дзеяслова

Дзеепрыметнік як дзеяслоўна-іменная форма. Пытанне аб месцы дзеепрыметнікаў у сістэме часцін мовы. Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыметніка (катэгорыі стану, трывання, часу; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыметніка ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыметніка (катэгорыі роду, ліку, склону; сінтаксічныя функцыі). Формаўтварэнне дзеепрыметніка. Поўная і кароткая форма дзеепрыметнікаў залежнага стану і іх ужыванне. Ад’ектывацыя і субстантывацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеепрыметнікаў. Сістэма сродкаў замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы.

Дзеепрыслоўе як дзеяслоўна-прыслоўная форма. Пытанне аб месцы дзеепрыслоўя ў сістэме часцін мовы. Граматычныя катэгорыі дзеепрыслоўя: дзеяслоўныя (катэгорыі трывання, стану; зваротная форма; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыслоўяў ад дзеяслоўных асноў) і прыслоўныя (нязменнасць, прымыканне да дзеяслова, сінтаксічныя функцыі). Формаўтварэнне дзеепрыслоўя. Адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў.

Ужыванне дзеепрыслоўяў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як сродкі стварэння сцісласці маўлення. Дзеепрыметнік у ролі эпітэтаў розных тыпаў.

### Тэма 34. Семантычная, граматычная, слова- і формаўтваральная, стылістычная адметнасць прыслоўя

Прыслоўе як часціна мовы: яго семантычная, марфалагічная і сінтаксічная адметнасць. Лексіка-граматычныя разрады прыслоўяў: азначальныя (якасныя, колькасныя, спосабу дзеяння, параўнання, сумеснасці) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты). Ступені параўнання (вышэйшая і найвышэйшая) якасных прыслоўяў, іх утварэнне і выкарыстанне. Элятыў як форма вышэйшай ступенні параўнання, якая страціла значэнне супастаўлення. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці, іх утварэнне і ўжыванне. Спосабы ўтварэння прыслоўяў.

Тэкстаўтваральная (інфармацыйная, эмацыянальна-ацэначная) роля прыслоўяў у тэкстах розных стыляў. Функцыя прыслоўяў у мастацкім стылі: прыслоўная метафара, прыслоўнае параўнанне, ампліфікацыя прыслоўяў і інш.

### Тэма 35. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы як асобая часціна мовы

Безасабова-прэдыкатыўныя словы, або словы катэгорыі стану, як асобны лексіка-граматычны клас слоў. Семантычная, марфалагічная, словаўтваральная і сінтаксічная адметнасць безасабова-прэдыкатыўных слоў. Класіфікацыя безасабова-прэдыкатыўных слоў паводле значэння. Ужыванне безасабова-прэдыкатыўных слоў у мове.

Пытанне аб мадальных словах у сучаснай лінгвістыцы. Мадальнасць і сродкі яе выражэння. Семантычныя разрады мадальных слоў. Суадноснасць мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы. Роля мадальных слоў у тэксце.

### Тэма 36. Сістэма службовых часцін мовы. Гукапераймальныя словы і выклічнікі

Класіфікацыя службовых слоў паводле граматычных значэнняў і функцый у сказе. Прыназоўнік як службовае слова, яго семантычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя адзнакі. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Суадноснасць прыназоўнікаў з іншымі часцінамі мовы. Класіфікацыя прыназоўнікаў паводле структуры: простыя, складаныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

састаўныя. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў. Ужыванне прыназоўнікаў з укоснымі склонамі назоўнікаў. Сінаніміка і варыятнасць прыназоўнікаў. Асаблівасці ўжывання некаторых прыназоўнікаў у беларускай мове. Састаўныя прыназоўнікі як адзінкі кніжнага маўлення.

Злучнік як службовае слова, яго семантычная і граматычная характарыстыка. Класіфікацыя злучнікаў паводле функцыянальнага прызначэння. Злучальныя (спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя, далучальныя, паясняльныя) злучнікі. Падпарадкавальныя (часавыя, прычынныя, мэтавыя, умоўныя, параўнальныя, уступальныя, тлумачальныя, выніковыя) злучнікі. Разрады злучнікаў паводле іх паходжання, структуры і спосабу ўжывання. Семантычныя і асемантычныя злучнікі. Адрозненне злучнікаў ад злучальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў).

Часціцы як непаўназначныя часціны мовы. Семантыка-граматычная адметнасць часціц. Класіфікацыя часціц: а) паводле марфалагічнага складу (простыя, састаўныя); б) паводле значэння (невытворныя і вытворныя); в) паводле значэння (часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні; мадальныя і мадальна-валявыя часціцы); г) паводле функцыі (словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы). Роля часціц у тэксце. Састаўныя часціцы як сродак стварэння экспрэсіі.

Месца выклічнікаў у сістэме часцін мовы. Агульная характарыстыка выклічнікаў. Разрады выклінікаў паводле значэння: эмацыянальныя, волевыяўленчыя і моўнага этыкету. Класіфікацыя выклічнікаў паводле паходжання: вытворныя і невытворныя. Суадносіны вытворных выклічнікаў са знамянальнымі часцінамі мовы. Выклічнікі іншамоўнага паходжання. Полісемантычнасць невытворных эмацыянальных выклічнікаў. Ужыванне выклічнікаў у вуснай і пісьмовай мове.

Гукапераймальныя словы. Значэнне і ўжыванне гукаперайманняў, іх адрозненне ад выклічнікаў. Агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія гукапераймальныя словы, іх лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VIII
## Сінтаксіс. Пунктуацыя

### Тэма 37. Сінтаксіс як раздзел граматыкі. Словазлучэнне і яго тыпы

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы. Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Паняцце сінтаксічнай сувязі. Асноўныя віды сінтаксічнай сувязі: злучэнне і падпарадкаванне. Сістэма сінтаксічных адзінак: словазлучэнне, просты сказ, складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства), перыяд. Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні, простым сказе, складанм сказе.

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа. Будова, значэнне і функцыі словазлучэнняў. Свабодныя і

сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні. Класіфікацыя словазлучэнняў: а) паводле граматычнага выражэння галоўнага слова (іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя); б) паводле сэнсавых адносін кампанентаў (аб'ектныя, азначальныя, акалічнасныя); в) паводле структуры (простыя і складаныя). Разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэннях: поўнае і няпоўнае дапасаванне, кіраванне і яго тыпы (прыдзеяслоўнае, прыйменнае, прыадвербіяльнае; прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае; слабое і моцнае), прымыканне. Нацыянальная адметнасць дапасавання і кіравання ў беларускай літаратурнай мове. Сінтаксічная сінаніміка.

## Тэма 38. Сказ як сінтаксічная адзінка. Просты сказ. Галоўныя і даданыя члены сказа

Паняцце сказа. Асноўныя прыметы сказа: камунікацыйнасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая і інтанацыйная завершанасць, граматычная афармленасць. Монапрэдыкатыўнасць і поліпрэдыкатыўнасць як адрознівальныя прыметы простага і складанага сказа. Простая поліпрэдыкатыўная адзінка. Тыпы сказаў: а) паводле мэты выказвання (апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя); б) паводле адносінаў да рэчаіснасці (сцвярджальныя і адмоўныя); в) паводле эмацыянальнай афарбоўкі (клічныя і няклічныя); г) паводле наяўнасці галоўных членаў сказа (двухсастаўныя і аднасастаўныя, бессастаўныя); д) паводле наяўнасці даданых членаў сказа (развітыя і неразвітыя). Поўныя і няпоўныя сказы. Словы-сказы і іх тыпы. Двухсастаўны сказ. Граматычная аснова двухсастаўнага сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа. Структурныя тыпы дзейніка і выказніка і спосабы іх выражэння ў сучаснай беларускай мове. Сувязь выказніка з дзейнікам, яе віды рэалізацыі ў сказе. Аднародныя дзейнікі і выказнікі.

Даданыя члены сказа: дапаўненне (прамое/ускоснае); азначэнне (дапасаванае і недапасаванае); акалічнасць (месца, часу, прычыны, мэты і інш.). Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. Сінкрэтызм у сістэме членаў сказа.

## Тэма 39. Аднасастаўныя сказы і іх тыпы. Няпоўныя сказы. Бессастаўныя сказы

Паняцце аднасастаўнага сказа. Класіфікацыя аднасастаўных сказаў: дзеяслоўна-адвербіяльныя, або выказнікавыя, сказы (пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя); субстантыўныя, або дзейнікавыя, сказы (намінатыўныя). Вкатыўныя сказы і канструкцыі з “назоўным уяўлення”.

Няпоўныя сказы і іх тыпы (эліптычныя, кантэкстуальныя і сітуацыйныя сказы).

## Тэма 40. Сінтаксічнае ўскладненне простага сказа

Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структурнай схемы. Семантычны і сінтаксічны аспекты ўскладненых сказаў. Сказы з

аднароднымі членамі. Граматычнае выражэнне аднародных членаў сказа. Злучнікавая і бяззлучнікавая сувязь аднародных членаў сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасабленне ўдакладняльных членаў сказа. Сказы з параўнальнымі зваротамі. Структурныя тыпы, значэнне і функцыя параўнальных зваротаў у сказе. Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, іх структура і функцыі. Размежаванне пабочных і ўстаўных канструкцый. Сказы са зваротkам. Структурна-граматычныя тыпы звароткa, яго значэнне і функцыі ў сказе. Зварот як стылістычны прыём мастацкага тэксту. Выкарыстанне ўскладненых сказаў у мове.

### Тэма 41. Камунікатыўная арганізацыя і стылістыка простага сказа

Камунікатыўная арганізацыя простага сказа. Актуальнае чляненне сказа, яго кампаненты. Парадак слоў і актуальнае чляненне. Спосабы выражэння тэмы і рэмы ў простым сказе.

Парадак слоў у сказе і яго функцыі (граматычная, камунікатыўная, стылістычная). Сцвярджэнне, абяцанне, пагроза, пабуджэнне (загад, просьба), пытанне як прагматычныя тыпы выказванняў у мастацкім стылі, у прыватнасці – у драматургічным падстылі. Стылістыка простага сказа ў функцыянальных стылях мовы.

### Тэма 42. Складаны сказ як поліпрэдыкатыўная адзінка

Паняцце складанага сказа. Структура складанага сказа. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаных сказаў і сродкі выражэння адносінаў (інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы). Класіфікацыя складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя, складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.

Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, размеркавальнымі, супраціўнымі, далучальнымі злучнікамі. Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаным сказе. Паняцце складаназалежнага сказа. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (зучнікі, злучальныя словы і інш.). Роля ўказальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў) у галоўнай частцы. Складаназалежныя сказы ўскладненай будовы: з некалькімі галоўнымі і з некалькімі даданымі часткамі. Тыпы падпарадкавання на ўзроўні шматчленных складаназалежных сказаў: паслядоўнае падпарадкаванне, сузалежнае падпарадкаванне (аднароднае і неаднароднае), камбінацыя розных тыпаў падпарадкавання. Паняцце бяззлучнікавага складанага сказа. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі бяззлучнікавых сказаў і спосабы іх выражэння. Камбінаваныя складаныя сказы. Дыферэнцыяльныя прыметы камбінаваных складаных сказаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Разнавіднасці сказаў кантамінаванай структуры, іх значэнне ў мове. Стылістыка складанага сказа.

### Тэма 43. Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ). Перыяд. Асаблівыя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення

Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ), або звышфразавае адзінства (ЗА), як мінімальная адзінка тэксту. Сродкі міжфразавай сувязі на ўзроўні ССЦ: уласна лексічныя, лексіка-граматычныя, граматычныя. Віды сувязі ў ССЦ: ланцужковая, паралельная, змешаная. Семантычная і структурная арганізацыя складанага сінтаксічнага цэлага.

Перыяд, яго структура і сродкі сувязі частак, функцыянальнае прызначэнне.

Асаблівая прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення: анафара, эпіфара, кальцо страфы, кампазіцыйны стык, паралелізм і інш. Структурная арганізацыя сінтаксічных прыёмаў і іх функцыя ў мастацкім стылі.

### Тэма 44. Чужая мова і асноўныя спосабы яе перадачы

Паняцце чужой мовы/чужаслоўя. Простая, няўласна-простая і ўскосная мова як асноўныя спосабы перадачы чужой мовы. Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы. Разнавіднасці простай мовы (маналог, дыялог, палілог). Няўласна-простая мова як адначленная канструкцыя, яе сінтаксічная і стылістычная роля.

Цытаты, іх афармленне і функцыі. Эпіграф як разнавіднасць цытаты, яго роля і афармленне. Стылістычнае выкарыстанне чужой мовы. Стылізацыя ў драматургічныя кантэксце.

### Тэма 45. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку

Прадмет і задачы пунктуацыі. Сувязь пунктуацыі з сінтаксісам. Прынцыпы беларускай пунктуацыі. Віды знакаў прыпынку: паводле функцыі (раздзяляльныя і выдзяляльныя); паводле ўжывання (адзіночныя, паўторныя, парныя). Спалучэнне знакаў прыпынку (коска і працяжнік, дужкі і коска).

Нарматыўныя знакі прыпынку. Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку. Аўтарскія знакі прыпынку.

Агляд асноўных правілаў пунктуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пытанні да экзамену**
**па курсе «Сучасная беларуская літаратурная мова»**

1. Прадмет, задачы і змест курса. Нормы і формы беларускай літаратурнай мовы. Вядомыя беларускія мовазнаўцы і іх навуковая спадчына.
2. Беларуская мова сярод іншых моў свету. Беларускія пісьменнікі і грамадскія дзеячы пра родную мову.
3. Прадмет, задачы і змест фанетыкі. Гук як найдрабнейшая адзінка мовы. Галосныя гукі і іх класіфікацыя. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных.
4. Зычныя гукі і іх класіфікацыя (паводле спосабу і месца ўтварэння, голасу і шуму і г.д.). Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні зычных.
5. Склад. Тыпы складоў у беларускай мове. Прынцыпы складападзелу. Асаблівасці беларускага націску.
6. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Фармаванне беларускага літаратурнага вымаўлення. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны адхілення ад іх.
7. Вымаўленне галосных і зычных гукаў, іх спалучэнняў.
8. Змест і задачы графікі. Алфавіт. Нялітарныя графічныя сродкі. Асноўныя прынцыпы беларускай графікі.
9. Звесткі з гісторыі беларускай графікі. Тры граматычныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьмнства.
10. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Фармаванне беларускай арфаграфіі.
11. Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе.
12. Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе.
13. Злітныя і паўзлітныя напісанні. Правілы ўжывання вялікай літары, скарачэння і пераносу слоў.
14. Граматыка як раздзел мовазнаўства. Граматычнае значэнне слова і спосабы яго выражэння.
15. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства, яго прадмет, задачы і змест. Марфемная структура слова (слова і марфема, тыпы марфем; аснова слова і яе тыпы).
16. Службовыя марфемы, або афіксы, і іх функцыі. Прадуктыўныя/непрадуктыўныя, рэгулярныя/нерэгулярныя афіксы.
17. Паняцце афіксоідаў: прэфіксоідаў і суфіксоідаў. Аманімія, мнагазначнасць, сінанімія і антанімія марфем.
18. Змены ў марфемнай структуры слова: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дыфузія, гаплалогія, замяшчэнне.
19. Словаўтварэнне як адзін са спосабаў узбагачэння мовы; утваральныя асновы (база) і словаўтваральныя сродкі (фарманты). Паняцце словаўтваральнага тыпу.
20. Агульная характарыстыка тыпаў і спосабаў словаўтварэння. Марфалагічны спосаб утварэння слоў і яго тыпы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. Разнавіднасці складання. Паняцце ўсячэння. Аналіз структуры слова, сінхраніі і дыяхраніі.
22. Прадмет і задачы марфалогіі. Сістэма часцін мовы.
23. Назоўнік як часціна мовы і яго лексіка-граматычныя разрады.
24. Граматычныя катэгорыі роду і ліку назоўніка.
25. Граматычнае значэнне склону назоўніка, асноўныя значэнні склонаў. Тыпы скланення назоўнікаў.
26. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Скланенне некаторых прозвішчаў і геаграфічных назваў. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі.
27. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў 1 скланення. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў 2 і 3 скланення.
28. Асаблівасці ўтварэння і функцыянавання назоўнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
29. Прыметнік як часціна мовы. Разрады прыметнікаў.
30. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў. Скланенне прыметнікаў.
31. Адметнасць утварэння прыметніка і яго ўжыванне ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.
32. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў. Няпэўна-колькасныя словы.
33. Скланенне лічэбнікаў. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы. Стылістычныя магчымасці лічэбніка.
34. Дзеяслоў як часціна мовы. Неазначальная форма дзеяслова. Асновы дзеяслова. Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы і іх тыпы.
35. Катэгорыя стану дзеясловаў. Паняцце трывання, катэгорыя трывання ў дзеясловах руху. Утварэнне суадносных пар трывання. Ступеннае ўтварэнне трыванняў.
36. Паняцце катэгорыі ладу. Абвесны,загадны, умоўны лад. Узаемазамяняльнасць формаў ладу ў залежнасці ад мэты і зместу выказвання.
37. Катэгорыя часу дзеясловаў (паняцце абсалютнага і адноснага часу). Цяперашні, будучы, прошлы час. Ужыванне формаў аднаго часу ў значэнні другога.
38. Катэгорыя асобы дзеясловаў. Безасабовыя дзеясловы. Утварэнне і функцыянаванне дзеясловаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
39. Займеннік як часціна мовы. Разрады займеннікаў і іх скланенне. Пераход займеннікаў у іншыя часціны мовы і наадварот. Роля займенніка ў мове.
40. Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс у – ў.
41. Дзеепрыслоўе як нязменная дзеяслоўная форма. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў.
42. Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў, асаблівасці ўтварэння і ўжывання іх формаў.
43. Часціцы як часціна мовы. Словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы. Класіфікацыя часціц паводле марфалагічнага складу, паходжання, значэння, функцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

44. Прыназоўнік як часціна мовы. Класіфікацыя прыназоўнікаў паводле марфалагічнай будовы і паходжання. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
45. Безасабова-прэдыкатыўныя словы, або катэгорыя стану ў беларускай мове. Роля прыслоўяў і безасабова-прэдыкатыўных слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
46. Злучнік як часціна мовы. Класіфікацыя злучнікаў паводле сінтаксічнай функцыі, паходжання, структуры і спосабу ўжывання.
47. Дзеепрыметнік як дзеяслоўная форма. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове.
48. Характарыстыка мадальных слоў, іх семантычныя разрады і функцыя.
49. Роля службовых часцін мовы, выклічнікаў і гукапераймальных слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
50. Выклічнік як часціна мовы. Гукапераймальныя словы.
51. Паняцце лексікі. Прадмет, задачы і змест лексікалогіі і яе сувязь з іншымі раздзеламі мовазнаўства.
52. Слова як лексічная адзінка мовы. Слова і паняцце. Лексічнае і граматычнае значэнне слова.
53. Тыпы лексічных значэнняў слова паводле спосабу намінацыі. Значэнні слоў паводле іх лексічнай спалучальнасці.
54. З’явы монасеміі і полісеміі ў мове. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў слова.
55. З’ява аманіміі ў мове. Тыпы амонімаў. Шляхі ўзнікнення амонімаў. Выкарыстанне аманіміі ў мове.
56. Паранімія і паранамазія. Ужыванне паронімаў у мове.
57. З’ява сінаніміі ў мове і яе сувязь з мнагазначнасцю. Тыпы сінонімаў.
58. Шляхі ўзнікнення сінонімаў. Функцыі сінонімаў у мове.
59. Паняцце антаніміі і яе сувязь з мнагазначнасцю. Тыпы антонімаў і іх функцыя ў мове.
60. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання: спрадвечна беларуская лексіка.
61. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання: запазычаныя словы.
62. Паняцце актыўнай і пасіўнай лексікі. Устарэлая лексіка, яе тыпы і роля ў мове.
63. Паняцце актыўнай і пасіўнай лексікі. Неалагізмы, іх тыпы і роля ў мове.
64. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання: агульнаўжывальная лексіка.
65. Лексіка абмежаванага ўжывання: дыялектызмы, іх віды і роля ў беларускай мове.
66. Лексіка абмежаванага ўжывання: прастамоўі, жарганізмы і іх тыпы і стылістычнае выкарыстанне ў мове.
67. Спецыяльная лексіка: тэрміны і іх віды, прафесіяналізмы і іх роля ў сістэме функцыянальных стыляў мовы.
68. Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі: паняцце ЛСП. Стылістычна нейтральныя словы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

69. Стылістычна афарбаваная лексіка: гутарковая і кніжная лексіка. Сістэма стылістычных памет.
70. Прадмет, задачы і змест лексікаграфіі. Звесткі з гісторыі лексікаграфіі.
71. Лексікаграфія. Энцыклапедычныя слоўнікі, будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедычным слоўніку.
72. Лінгвістычныя слоўнікі, асаблівасці структуры слоўнікавых артыкулаў у лінгвістычных слоўніках.
73. Прадмет, задачы і змест фразеалогіі. Адметнасць фразеалагічных адзінак.
74. Варыянтнасць фразеалагізмаў.
75. З’явы аманіміі, антаніміі ў фразеалогіі.
76. Тыпы фразем паводле семантычнай злітнасці кампанентаў.
77. Тыпы фразеалагізмаў паводле суаднесенасці з сінтаксічнымі адзінкамі: фраземы-спалучэнні і фраземы-словазлучэнні.
78. Фразеалагізмы са структурай сказа.
79. Фразеалагізмы паводле суаднесенасці з часцінамі мовы: назоўнікавыя фраземы.
80. Фразеалагізмы паводле суаднесенасці з часцінамі мовы: прыметнікавыя фраземы.
81. Фразеалагізмы паводле суаднесенасці з часцінамі мовы: дзеяслоўныя фраземы.
82. Фразеалагізмы паводле суаднесенасці з часцінамі мовы: прыслоўныя фраземы.
83. Фразеалагізмы паводле суаднесенасці з часцінамі мовы: мадальныя фразеалагізмы.
84. Выклічнікавыя фразеалагізмы.
85. Фразеалагізмы, несуадносныя з часцінамі мовы.
86. Дыферэнцыяцыя фразем паводле стылістычнай афарбаванасці: кніжныя і нейтральныя фраземы.
87. Дыферэнцыяцыя фразем паводле стылістычнай афарбаванасці: размоўныя і прастамоўныя фразеалагізмы.
88. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання: спрадвечна беларускія фразеалагізмы.
89. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання: запазычаныя фраземы. Калькі і паўкалькі ў фразеалогіі.
90. Фразеалогія ў шырокім сэнсе слова: прыказкі і крылатыя выслоўі.
91. Фразеалогія ў шырокім сэнсе слова: перыфразы, іх віды і функцыя ў мове.
92. Выкарыстанне фразеалагічных зваротаў. Фраземы і іх пераклад.
93. Беларуская фразеаграфія, гісторыя яе фарміравання. Асаблівасці будовы фразеаграфічнага артыкула.
94. Тыпы фразеаграфічных слоўнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дыдактычныя матэрыялы**
**па курсе "Сучасная беларуская літаратурная мова"**

1. Выпішыце словазлучэнні і зрабіце іх сінтаксічны аналіз.

Ні ласкай, ні мікстураю ніколі
Не залячыць параненай душы.

С.Грахоўскі

2. Спішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку. Зрабіце структурна-граматычны аналіз членаў сказа.

А. Спадчына гэта наша родная мова харство навакольнай прыроды каштоўнасці здабытыя нашымі папярэднікамі.

В.Вітка

Б. Гэта была даволі ўтульная мясцінка куды бегалі гуляць дзеці і прыходзілі пасядзець у засені тапаляў і клёнаў дарослыя.

У.Карпаў

3. Прачытайце. Назавіце мікратэму ў прыведзеным ССЦ, вызначце тып сувязі сказаў у ім і назавіце тыя моўныя сродкі (лексічныя паўторы, трывальна-часавыя формы і інш.), якія працуюць на яго пабудову.

Увосень, калі стаіць пагода, шасціць пад нагамі мох і сівец, гараць сіняватыя хвойкі верасу на пасецы… Па ім поўзаюць мурашкі, вялікія, з крыльцамі, і лётаюць пчолы. Сядзе пчолка на верасовую галінку, гайдаецца, пасля нахіне яе аж да самай зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крыльцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, як памерла – п'е.

І.Пташнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Прачытайце. Адкажыце, якія стылістычныя фігуры і асаблівыя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення выкарыстоўваюць у прыведзеных урыўках аўтары. Назавіце тып сказа ў заданні **В**.

**А**. Першы баравік, які трапіўся, выклікаў радасць і смех. Буры, здаровы, цвёрды да ***крамянасці,*** толькі што ад зямлі, ён холадам апёк пальцы.

І.Пташнікаў

**Б**. Канец… Як проста гэта слова і мнагазначна, заўжды нова!

Я.Колас

**В**. …За вёскаю – рэчка, за рэчкаю – горка, за горкаю – поле, на полі – камень, а на тым камені-валуне стаіць-зіхаціць залатая карона…

А.Разанаў

5. Спішыце сказ, пастаўце знакі прыпынку, растлумачце іх. Пабудуйце схему.

Дрэвы стаяць абапал дарогі ў сонечных промнях такія ціхія што колькі ні глядзі на іх колькі ні напружвай вочы так і не ўбачыш каб дзе-небудзь зварухнуўся хоць адзін лісток…

Я.Сіпакоў

6. Спішыце. Пастаўце знакі прыпынку, растлумачце іх. Пабудуйце схему сказа, вызначыўшы яго від і тыпы адносінаў паміж часткамі.

Мова,
Пявучая родная мова,
Ты – уладарка нявызнаных скарбаў,
Столькі значэнняў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучання і фарбаў

Мае ў сабе тваё кожнае слова.

А.Зарыцкі

7. Прачытайце, вусна растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе. Пабудуйце схему сказа, вызначце яго тып.

Ёсць такі час калі ўсё выспявае і нішто не трывожыць тады велічнага спакою які ахоўвае расліны што безліччу каласоў насяляюць зямлю.

П.Броўка

8. Прачытайце, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа.

Сытым птушкам ціха спачуваю
Бо і сам я голуб гарадскі
Пах зямлі ўзаранай забываю
І не чую звону асакі

А.Пысін

9. Прачытайце. Спішыце, аформіўшы дыялог у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Назавіце тыпы выдзеленых сказаў. Перакажыце дыялог з выкарыстаннем ускоснай мовы.

**Маня**. **О-о, Арына Радзівонаўна на нагах.** **Добрай ранічкі вам!** Вы такая светленькая, свежанькая, толькі крышку невясёленькая. Гэта ён у вас быў?

**Арына Радзівонаўна**. **Хто?**

**Маня. Участковы.**

**Арына Радзівонаўна**. **Быў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Маня. Чаго?**

**Арына Радзівонаўна**. Хто яго ведае? **Прыйшоў, паглядзеў, пайшоў.**

**Маня.** А ў мяне дапытваўся. **Во тут, на ступеньках, сустрэліся.**

**Арына Радзівонаўна**. **Пра што?**

10. Спішыце, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх, акцэнтуючы ўвагу на розныя спосабы ўскладнення сказа.

А калі раптам па-восеньску жоўта і ўрачыста засвецяцца гаі і дубровы то пад кожнаю бярозкаю абавязкова прарэжацца падбярозавік пад кожнаю асінаю падасінавік а баравікі гэтыя нясмелыя ***лесяняты*** выходзяць тады з-пад змрочных ялін якія нібы квактухі крылле распусцілі ля самай зямлі галіны выходзяць на сонечныя паляны а то нават і на самае поле.

Я.Сіпакоў

11. Назавіце сказы з прамым і адваротным парадкам слоў, акрэсліўшы ў іх тэму і ***рэму***.

Я спяваў аб роднай пушчы,
Аб ялінах-прыгажунях.

Н.Гілевіч

А якія пяшчотныя мары прыходзілі з гэтым вясновым пахам!

А.Кулакоўскі

Блішчаць зоркі, чыстыя, зыркія, нібы вымытыя ў расе.

І.Навуменка

Будзе год залаты, хлебадайны,
Трудны год ярыну абміне.

Я.Янішчыц

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Прачытайце. Вусна назавіце тыпы сказаў. Зрабіце сінтаксічны разбор другога сказа.

Вечар. Гадзіна каторая?
Люднаю плошчай іду.
Мары мае ясназорныя!
Водбліскі ўзбуджаных дум!

Алесь Звонак

13. Складзіце сказы па наступных схемах, растлумачце знакі прыпынку. Назавіце тыпы сказаў.

**[ ] , ( ) , ( ).**

**[ ( ) ] , ( ).**

**[ ] , ( ) , ( ) , ( ).**

14. Спішыце, расставіўшы знакі прыпынку. Вусна растлумачце іх пастаноўку.

Кароткія змрочныя дні наводзілі паныласць і смутак прыгняталі добры настрой і адчуванне. Быў той час калі людзі прасілі Прыходзіла б ужо зіма. Няхай бы падсушылі марозікі зямлю каб яна не тапілася ў гразі і ў балоце.

І вось у адзін дзень бязладныя неспакойныя хмары нібы спалоханыя птушкі падняліся вышэй зрабіліся болей тугімі. Падзьмула з поўначы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здаровым халадком. Зямля сушэла пакрывалася цвёрдаю скарынкаю. А пад поўнач пасыпаў сняжок заложны спорны густы і сухі.

Я.Колас

15. Спішыце, паставіўшы неабходныя знакі прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа.

Мова мая
Для мяне ты заўсёды
Сонца вясновага цёплы прамень
Дзіва вясновага поўныя соты
Рэчка што асвяжае ў сухмень

К.Цвірка

16. Спішыце, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа.

…Нібы маці берагчы
Працаўніцу нашу мову
Бо яна жыцця зачын
І пачатак песні новай

Я.Сіпакоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Уважліва прачытайце ўрыўкі; спішыце, паставіўшы, дзе трэба, знакі прыпынку. Вусна назавіце тыпы сказаў у залежнасці ад мэты выказвання, ад наяўнасці / адсутнасці галоўных і даданых членаў сказа.

**А**. Зіма. Снягі. Мароз. Завеі.
Дарога звонкая як сталь.
Бярозы ў шэрані сівеюць.
Палі бялеюць як паркаль.

П.Глебка

**Б**. Канчаецца паляна, пачынаецца бярэзнік, куп'ё. На ім высокі балотны мох мяккі, мяккі. Ступіш на яго нічога не чуваць пад нагою. Толькі з куп'я пырскаюць зусім яшчэ белыя журавіны нібы ты наступіў у агародзе на сухія струкі фасолі…

І.Пташнікаў

18. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа з простай мовай. Вусна перабудуйце сказ , спачатку замяніўшы простую мову на ўскосную, а затым – на няўласна-простую.

Слушна кажуць: "Трэба слова ўзважыць,
Перш чым ім каго з размаху спляжыць".

У.Папковіч

19. Спішыце, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх. Пабудуйце схему апошняга сказа.

Потым зусім нечакана выбліснула сонца маладое і румянае паўабручом выгнулася праз ўсё неба вясёлка. І трывожна білася сэрца калі я стаў пад караваю грушаю-дзічкаю адзін сярод чыстага поля мокры да апошняга рубца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і глядзеў як усюды падымаецца прыгнутая дажджом зеляніна – гром выркатаў ужо далёка як буркатлівы паганы свёкар.

Б.Сачанка

20. Складзіце сказы па наступных схемах. Зрабіце сінтаксічны разбор апошняга сказа.

**[ ] , [ ] , (** каб**… ) .**

**[ ] , (** што**… ) , [** і **] .**

**[ ] , (** дзе**… ) ; [ ] , [ ] , (** якая**… ) .**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Заданні для самакантролю

**1**

1. Праскланяць назоўнікі *бібліятэка*, *каталог*, *моладзь*.

2. У наступных словах уставіць прапушчаныя літары:

ра…крытыкаваць, ахаракт…зываць, а…каз, грама…ства, камп’ют…р, канферанс…е, суб…ект, за…сці, лі…ба, нос…біт, ст…гадовы, шмат…омны, с…местр, а…кцыён, без…дэйны.

3. Запісаць прыведзеныя словы па-беларуску. Прачытаць у адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем:

адресат, лидер, интеллигент, командировка, смысловой, сопроводительный, суперобложка, стеллаж, дописывать, опись, содержание, Ожегов, Рембрандт.

**4**

1. Пастаўце назоўнікі ў форме Р.скл. адз. ліку, вусна растлумачце выбар канчатка.

Бібліятэкар, стэлаж, каталог, раман, верш, чытач, подпіс, кілаграм, прэцэдэнт, погляд, твар, голас, том, раманс, варыянт, продаж, гумар, звычай, алфавіт, абед, інтэлект.

2. Дапішыце патрэбныя канчаткі ў наступных словазлучэннях:

Дзве нов… кніг…, сто сорак два чытач…, тры цэл… і чатыры дзесят…, чатырыста тры…аць чатыры рубл…, дзевяноста два кілаграм…, паўтар… цэнтнер…, тры апошн… дн…, сёння – дваццаць дзевят… ліпеня, не чыталі дзве заключн… главы, мінула аж цэл… два месяцы, 1 цэл і тры сём… .

3. Прачытайце словы ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем:

Перапісчык, выкладчык, адценне, лічба, аддаць, раздаць, носьбіт, экзамен, вакзал, сталічны, грамадскі, філасофскі, песня, трагедыя, дыялог, схематычны, спіс, след, скептык, апладысменты, змена, вучышся, на вокладцы, не відаць, у палатцы, з жаданнем, ад’езд, з іголачкі.

**2**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Праскланяць назоўнікі *геній, скрыпач, подпіс*.

2. Утварыць усе магчымыя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання прыметнікаў:

цікавы, разумны, лясісты, гераічны, дрэнны, белы, карысны.

3. Спісаць, устаўляючы замест прапушчаных літар ***і, й, ы***:

па…менна, пра…нфармаваць, без…ніцыятыўны, контр…ігра, не…маверна, звыш…мклівы, без…дэйны, с…сці, уз…ходжанне, вока…мгненна, па…льгоце, заііігрываць.

**3**

1. Праскланяйце лічэбнікі шаснаццаць, сто, трыста.

2. Запішыце словы па-беларуску:

ремонт, шедевр, церемония, редактор, черновик, календарь, деликатность, лотерея, почерк, фешенебельный, глотать, компьютер, менеджер, менеджмент, кредит, факультет, платёжеспособность, тираж, маркетинг, коммуникативность.

3. Выберыце малую ці вялікую літару пры напісанні слоў:

(Б,б)еларускі (Д,д)зяржаўны (У,у)ніверсітэт (К,к)ультуры і (М,м)астацтваў; (Д,д)ом (У,у)рада, (Д,д)ом (Д,д)руку, (Н,н)ацыянальная (Б,б)ібліятэка, (К,к)упалаўская (П,п)рэмія, (Б,б)ыкаўскі герой, (З,з)аслужаны (Д,д)зеяч (К,к)ультуры, (М,м)іністэрства (К,к)ультуры, (М,м)ележаўскія (Ч,ч)ытанні, (В,в)ялікая (А,а)йчынная (В,в)айна, (Д,д)амоклаў меч, (С,с)луччына, (Р,р)ычард (І,і)львінае (С,с)эрца, Леанарда (Д,д)а Вінчы, (Д,д)зед (М,м)ароз, (М,м)інскія вуліцы, (Л,л)ітаратурны (М,м)узей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5**

1. Праскланяйце лічэбнікі **42, 2006-ы, ½.**

1. Ад назваў гарадоў утварыце і запішыце назвы іх жыхароў.

Мінск, Гомель, Гродна, Брэст, Магілёў, Віцебск, Пінск, Маладзечна, Мазыр, Полацк, Орша, Нясвіж, Слонім, Ліда

2. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце і запішыце прыналежныя прыметнікі:

(Купала) паэма, сябар (кніга), сатыра (Крапіва), (выкладчык) просьба, (Скарына) першадрукі, (бацька) даручэнне, (маці) ручнік, (Алеся) песня, (Саша) выступленне, (Брыль) стыль.

**6**

1. Прасклaняйце займеннікі **нехта, мы, які-небудзь.**

2. Запішыце правільна, раскрываючы дужкі, прыназоўнікі, злучнікі і часціцы

(з) пад Оршы, па (за) творчасцю, усё (ж) яшчэ, збылося (такі) жаданне, пакуль (што) лёгка, (за) тое застаецца надзея, што (небудзь) цікавае, прынёс (жа) кнігу, усё (ж) такі дачытаў, (абы) які, (абы) зрабіць, які (сьці) том, куды (сь) пакласці, пакуль (што), абы (з) кім, з (за) святла, пры (тым) цікава.

3. Перакладзіце словы на беларускую мову, вусна растлумачце правапіс **д-дз', т-ц'**:

библиотека, текст, дети, натюрморт, эпизодик, авторитет, аттестат, диплом, дискуссия, диспут, дисциплина, идеал, командировка, билетёр, студент, интеллект, университет, факультатив, Тютчев, Вивальди, тенденция.

**7**

1. Праскланяйце лічэбнікі **двое, тысяча, паўтары (гадзіны), чатыры.**

2. Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце ўжыванне часціц **не, ні** і напісанне іх разам ці асобна з рознымі часцінамі мовы:

Дзяцінству (не, ні) вярнуцца (не, ні) да цябе, (не, ні) да мяне; ужо снегу (не, ні) следу; (не, ні) днём, а пад вечар; (не, ні) празаік, а паэт; яшчэ (не, ні) прачытаныя кнігі; гэту кнігу (не, ні) мог я (не, ні) узяць; (не, ні) укамплектаваны фонд; (не, ні) вялікі тыраж.

3. Запішыце наступныя словы па-беларуску.

Контрастный, выездной, счастливый, ванна, милосердность, коррекция, контекстный, группа, вестник, гамма, проездной, сердце, Ги де Мопассан, Рембрандт, извинение, начитанность, подписное издание.

**8**

1. Праспрагайце дзеясловы: **даць, друкаваць, браць.**
2. Утварыце ад прыметнікаў усе магчымыя формы ступеней параўнання: лёгкі, далікатны, дарагі, ліпкі, ганарысты, каштоўны, разумны, прыгожы.

3. Устаўце, дзе трэба, **Ь** ці **'**.

Подз…віг, він…етка, інтэрв…ю, суб…ект, двух…ярусны, кар…ера, саслоў…е, фел…етон, кур…ер, мен…шы, бол…шы, прэм…ера, міл…ярд,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бул…ён, ледз…ве, канферанс…е, л…е, п…еса,іл…гота, Юр…я, Традз…якоўскі, Анатол…евіч, Аляб…еў, Дзяменц…еў, калос…се, пес…ня, восен…скі, Чэрвен…скі, Рэйк…явік.

## 9

1. Праспрагайце дзеясловы **належаць, несці, есці.**

2. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Пять новейших изданий, 2/5 читателей, сегодня – 20 марта, в трёх шагах от нас, с пятьюдесятью семью участниками, пятиэтажный дом, четырёхкомнатная квартира, удваивать счёт, пересказывать книгу, что-то комбинировать, записывать в блокнот, доказывать правоту, полностью исследовать.

3. Паставіць назоўнікі ў форме меснага склону.

Агляд, каталог, фонд, альманах, архіварыус, аўтар, бенефіс, маркетынг, вопіс, каляндар, дыспут, рэжысёр, прект, наклад, інтарэс, шрыфт, асяродак, доктар, скрыпач, ордэр, намер, слухач, прафесар, Мележ, Караткевіч, Брыль, Шамякін, Амар Хаям, Тыль Уленшпігель, Стэфан Цвэйг, Гашак.

## 10

1. Пастаўце наступныя назоўнікі ў форме творнага склону:

Беларусь, памяць, ветлівасць, Нарач, веліч, запаведзь, шыр, любоў, творчасць, моладзь, госць, адказнасць, подпіс, прыяцель, бюлетэнь, студзень, дыяпазітыў, стаж, Палессе, Хатынь, М.Лужаніе, г. Жлобін, І.Шамякін, г. Барысаў, А.Вялюгін, Т.Шаўчэнка, К.Федзін, К.Крапіва, В.Вітка, Ф.Скарына, З.Бядуля.

2. Растлумачце па-беларуску наступныя тэрміны:

публічная бібліятэка, прэм’ера кнігі, прэс-канферэнцыя, рабочае месца бібліятэкара, жанравая выстава, загаловак, выхадныя звесткі (даныя), кантрольны экземпляр, біяграфічны слоўнік, бібліятэчны каталог, бібліятэка-філіял, бестселер, аўтарскі вечар, аўдыёвізуальны дакумент, асартымент платных паслуг, аркуш, арфаэпічны слоўнік.

3. Устаўце замест прапушчаных літар **о** ці **а**.

М...вазнаўца, д...браякасны, св...асаблівы, м...цнадзеючы, ст...гадовы, ш...сцігадзінны, асн...вапалажэнне, д...ўгатэрміновы, раб..тадавец, п...ўкнігі, п...ліклініка, шт...лета, выс...каідэйны, в...гнетушыцель, ж...ўталісце, гр...маадвод, ст...годдзе, п...ўметра, р...знакаляровы, м...тацыкл, ф...таграфія, ф...таэцюд, шт...тыднёвы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Карткі для ўдасканальвання ўсіх відаў моўных разбораў**

**1**

Зрабіце словаўтваральны аналіз слоў **перагаворвацца, шырокафарматны.**

**2**

Зрабіце марфемны аналіз слоў **паглыбіць, навеліст.**

**3**

Зрабіце фанетычны аналіз слоў **перыёдыка, снегапад.**

**4**

Зрабіце фанетычны аналіз слоў **усёдаравальнасць, заадно.**

**5**

Зрабіце графічны аналіз слоў **дзяжурны, пацяплець.**

**6**

Падзяліце словы на склады.

Неспазнаны, абшар, растлумачваць, бязмоўны, па-веснавому, ацаніць, учацвярых, пралеска, звышхуткасны, памылка, жыццяздольны, бортнік, дойлід, узбярэжжа.

**7**

Зрабіце словаўтваральны аналіз слоў **усмешка, размалёўваць, ЭВМ.**

**8**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых назоўнікаў.

Ці не жнівеньскія туманы ноччу наліваюць воскам жыты?.. ( І. Пташнікаў)

**9**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых прыметнікаў.

У асеннім лесе таксама добра думаецца. Але думкі тут маюць іншую форму: яны яркія, кароткія і хутка змяняюць адна адну (І. Шамякін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**10**

Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

Цёмнае неба над возерам прарэзала ад краю да краю доўгая і няроўная агністая лінія маланкі. За ёю бліснула другая, трэцяя ( В. Вольскі).

**11**

Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых дзеясловаў.

…Дождж пераціх, але над Дзвіной яшчэ імжыла, і вясёлка не бякла, красавалася, упрыгожваючы неба і зямлю ( Т. Хадкевіч).

**12**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых слоў.

На ўсходзе – дзве вясёлкі: ніжэй – ярчэйшая, вышэй – слабейшая (Я. Брыль).

**13**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых слоў.

Высока-высока ў блакіце
Яшчэ клекаталі буслы.
А тут ім адказвала ў жыце
Сям'я перапёлак малых ( К. Кірэенка).

**14**

Зрабіце марфалагічны аналіз займеннікаў.

Як пухам, сняжком пасыпаю
І хвою, і елку, і клён;
Хто ў госці ка мне забярэцца,
Тулю тых, галублю іх сон ( Я. Купала. Мароз).

**15**

Зрабіце марфалагічны аналіз прыназоўнікаў і арфаграфічны – прыметнікаў **светлы, падснежны.**

На паляне ў светлым пералеску
Расцвілі налітыя расой
Сінія падснежныя пралескі
Пад аховай урачыстых хвой. ( П. Панчанка)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**16**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых формаў дзеяслова.

Залачонымі пырскамі будзе ўзлятаць з-пад ног раса, збітая з муравы, а прымятая нагамі мурава будзе павольна падымацца насустрач сонцу (П. Галавач).

**17**

Зрабіце марфалагічны аналіз дзеепрыслоўяў.

Сонца схавалася. Па полі пабеглі палахлівыя цені, змяняючы і блытаючы колеры (Т. Хацкевіч).

**18**

Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых слоў:

І многа яшчэ розных начных гукаў жыве, толькі не ўсе іх ведае чалавек… (А. Жук); Але ноч не вечная, нават самая цёмная і доўгая (Л. Дайнека).

**19**

Зрабіце марфалагічны разбор выклічнікаў і гукапераймальных слоў.

Дзьмухне ветрык – каляныя сухія лісты і зашамацяць між сабой: “ Шы, шы, шы…” ( Р. Ігнаценка); О, ляціце, журавы, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы крыгаход! ( М. Стральцоў)

**20**

Зрабіце марфалагічны аналіз часціц.

А як добра ў чэрвені ў жытным! ( П. Броўка); Не наглядзецца на воблакі ў бязветраны дзень ( І. Грамовіч).

**21**

Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

Паўднёвы бераг большай затокі… пакрыты вечна жывым сасновым шумам.

Хораша тут, калі бывае час палюбавацца! ( Я. Брыль)

Відаць, шчасце нельга ўзяць у рукі і разгледзець, бо шчасце – гэта заўсёды лінія гарызонта, а на яе не наступіш нагою ( Я. Сіпакоў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэст па пунктуацыі (кантроль за СРС)**
**Курс: Сучасная беларуская літаратурная мова**

1. Пастаўце знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам, пракаменціраваць факультатыўнасць пастаноўкі знакаў прыпынку ў асобных выпадках.

Мы людзі свабодныя, вольныя птахі (Я.Купала); Найвышэйшая мэта чалавека жыццё, і кожны дзень чалавек павінен павітацца, пажадаць таму, з кім сустрэўся, жыцця. Значыць, павітанне гэта пажаданне жыцця (У.Юрэвіч); Радзі штогод, радзімая зямля, краса твая паэзія мая (Я.Пушча).

2. Пастаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа, вусна патлумачыць.

Дрэвы раку траву будынкі лесніковага двара чырвоныя сінія жоўтыя скрыначкі вулляў усё, над чым так добра і так яшчэ боязна планіраваць на няўпэўненых радасных крылах (Я.Брыль); І швец і жнец і на дудзе ігрэц (Прыказка); Над восеньскім полем адзіная зорка То знікне то зноў задрыжыць угары (С.Грахоўскі).

3. Пастаўце знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа, адасобленыя члены сказа падкрэсліць і вызначыць іх від.

Князёўна ігумення выдатная асветніца святая Еўфрасіння пакінула пра сябе вечную памяць у душы народа (У.Арлоў); Пакрытыя інеем яблыкі былі быццам у белай вясновай квецені (У.Карпаў); Хіба ўвосень не расцвітае прыгажуня-яблынька зведзеная ў зман здрадлівай ласкай бабінага лета? (І.Навуменка); Туды далей ішлі беразнякі спалоханыя першымі павевамі восені і ад гэтага нейкія ўзрушаныя (І.Пташнікаў); І штодзень кладучыся спаць ні ў кога няма ўпэўненасці, што прачнецца ўранні жывы і здаровы, што будзе мець працу і сродкі існавання (Б.Сачанка); Глядзелі на Ганну, разважалі і за малым выключэннем прыдзір з жанок згаджаліся: нявеста, нічога не скажаш! (І.Мележ).

4. Адасобіць параўнальныя звароты і падкрэсліць словы, якія яны паясняюць.

Я ўкленчыў перад агеньчыкам нібы вогнепаклоннік прасіў не патухаць, а жыць і гарэць (С.Грахоўскі); І ў цішыні касмічных трас стракозы быццам верталёцікі ім прыгадаюцца не раз (П.Панчанка); У гэтыя хвіліны яна для яго як маці (І.Навуменка); Для Бойкі навіна была як гром з яснага неба (І.Кудраўцаў).

5. Адасобіць звароткі. Пракаменціраваць знакі прыпынку пры іх.

Дык чаруй жа людзей паміж моваў другіх
І гучы вечна ярка і нова
Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх
Беларуская родная мова

(А.Ставер);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ах восень восень ты пад сонцам
Неапісальнай пекнаты,
Ты раскідаеш,
Як красёнцы,
З кляноў барвовыя лісты

(П.Броўка).

6. Паставіць знакі прыпынку пры выклічніках і гукапераймальных словах.

Ах вунь ён дзе, клянок! Невялічкі, зусім непрыкметны побач з волатамі-дубамі; улетку, напэўна, і не бачыў бы яго (І.Шамякін); Паміж акном і плотам – голы вішняк. Гоп! на галінках прыселі дзве птушкі. Не вераб'і, а сініцы, бо ў іх зялёныя спінкі, волле жоўтае, а галоўкі чорныя з белымі шчочкамі. Ці-сік, ці-сік снуюць яны то ўверх, то ўніз па галінках, карычневых нават здалёк (Я.Брыль).

7. Паставіць прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачыць прычыну іх пастаноўкі.

І цікавілася маці сэрца матчына вядома як на службе там дзяцяці, ці там лепей, ці мо дома? (Я.Купала); З гістарычных крыніц вядома што пачынаючы з XV стагоддзя ў Белавежскую пушчу ездзілі на паляванне літоўскія князі польскія каралі і нарэшце рускія цары (В.Вольскі).

8. Выдзеліць устаўныя і пабочныя словы, словазлучэнні і сказы.

Я тым часам уважліва агледзеўся ў хаце было багата кніг і запыніў позірк на томе французскіх філосафаў-асветнікаў, што ляжаў на стале (А.Пісьмянкоў); Міншчына! Яна сустрэла нас узгоркаватымі барамі, грыбным пахам баравікі помніцца траплялiся да канца кастрычніка павевамі смалы-жывіцы… (У.Карпаў).

9. Паставіць знакі прыпынку ў складаных сказах і вызначыць тып складаных сказаў.

Спакон вякоў пяе народ І песні б'юць жывой крыніцай (С.Крывец); Туман з рэчкі ці лагчыны або дым з пастушковага вогнішча калі ўзнімецца дык невысока стаіць над зямлёю (К.Чорны); Падперазаў фарсісты, дужы дуб Зялёны пояс хмелю з кутасамі І ў яр глядзіць дзе выпіўшы ваду Аер шаволіць вострымі вусамі (Р.Барадулін); Але там бялеліся верасы ў маладым цвеце зірні бы снег рэдкі выпаў (І.Пташнікаў); Грамы варочаюцца ў небе А на зямлі спакой такі Ажно чуваць як звонка недзе Лапочуць крыллем матылькі (Г.Бураўкін);

За дробналессем якое ўжо высыхала ад ранішняга але вельмі цёплага сонца пачалося знаёмае канюшыннае поле дзе ласяня з маці не раз ласаваліся смачнаю травою калі не было надта горача то і ляжалі адпачывалі напіўшыся вады ў блізкай рэчцы і вяртаючыся ад яе ў лес (Г.Далідовіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Паставіць знакі прыпынку пры простай мове:

а) Кажуць:
Цішэй едзеш – далей будзеш.
Мо паверыць?
А за кукіш круп не купіш.
А я думаў?
Праўда люба, хоць і груба.
Ці заўсёды?
Папрацуеш – смак пачуеш.
Мо і праўда?
Кажуць: Смерць вянчае славай.
Пачакаю? (М.Танк);

б) Машы ўспомніўся запіс у Алесіным дзённіку ўчора ён выпадкова трапіў ёй у рукі У чым паэзія нашага жыцця (І.Шамякін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданні для самакантролю**

1. Спішыце апошні сказ, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку; вызначце від першага сказа. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Купала прыйшоў, каб сказаць усяму чалавецтву: звярніце ўвагу на мой народ – старажытны славянскі народ. Паглядзіце, якія цуды зроблены яго рукамі, якімі незлічонымі скарбамі багаты ягоны край. Загляніце ў душу гэтага народа паслухайце якія дзівосныя легенды і казкі складзены ім якія непаўторна-самабытныя песні гучаць на яго зямлі якая прыгожая і мілагучная яго мова!..

Н.Гілевіч

2. Прачытайце. Вызначце тыпы ўсіх сказаў, характарызуючы моўныя сродкі іх ускладнення. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Талент настаўніка, яго майстэрства, высокая педагагічная культура – не толькі набыткі і каштоўнасці нейкай адной канкрэтнай школы, гэта наша ўсеагульнае, усенароднае духоўнае багацце, плён ураджаю ўсіх вялікіх сейбітаў.

В.Вітка

3. Спішыце апошні сказ, расстаўляючы ў ім знакі прыпынку. Зрабіце ўказаныя разборы.

Сонца падымаецца над лесам. Яно слізгае па вяршалінах дрэў і западае ў прагаліны. Лес пачынае дыміцца густымі пахамі . Бесклапотна цвыркаюць птушкі. Яны то гойдаючыся пырхаюць з дрэва на дрэва то вылятаюць у поле дзе падняўшыся ў неба сваім танюткім і нескачоным звонам заліваюцца жаўранкі...

Я.Скрыган

4. Прачытайце. Вусна растлумачце пунктуацыйнае афармленне сказаў. Зрабіце ўказаныя разборы.

Гавораць : “Я ведаў, што без навукі жыць цяжка, і стараўся вучыцца”, “Мой брат заўсёды цягнуўся да навукі”, “Вельмі ён хацеў папасці ў горад”, “Увесь час ён сіліўся ўзбіцца на гаспадарку”, “Усім сэрцам я імкнуўся да яе”, “Усё выглядае нармальна. А між тым мы і тут часта абкрадаем сябе і ўсё гэта пачынаем пісаць праз “імкнуўся”...

Я.Скрыган

5. Перапішыце сказы, афармляючы лічэбнікі на пісьме словамі. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

У XII стагоддзі ў Полацку жыў і працаваў выдатны майстар-ювелір Лазар Богша. У 1161 годзе ён па заказу Ефрасінні Полацкай стварыў крыж – шэдэўр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

(“Збор помнікаў гісторыі
і культуры Беларусі...”)

6. Прачытайце. Вусна растлумачце расстаноўку знакаў прыпынку; назавіце тыпы ўсіх сказаў. Зрабіце ўказаныя віды разбораў.

Адценне слоў – не глупства,
Ты ім не пагарджай.
Скарынка. Скіба. Луста.
Акраец. Каравай.
Акраец – шлях, дарога



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І зайцаў хлеб лясны.

Скарынка – сум , трывога

І боль былой вайны.

П.Панчанка

7. Спішыце. У першым сказе пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

А луста слова сытнае

Духмянае і шчодрае.

Яно ад маці – сітнае

Ці наздравата-чорнае.

А каравай – вясельнае,

Святочнае яно.

На ручніку нясе яно

І радасць, і віно.

П.Панчанка

8. Прачытайце. Пастаўце ў сказах знакі прыпынку і растлумачце іх. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

...Роднай мовай звонкай і пявучай

Размаўляюць з рэчкамі лясы.

Хай зямля мая спяваць цябе навучыць

Як мяне вучыла некалі мой сын...

В.Іпатава

9. Прачытайце. Спішыце, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Шумлівы лес

Падручнік роднай мовы.

Тут дрэвы

Як назоўнікі

Стаяць

А птушкі утвараюць дзеясловы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пяюць і свішчуць,

Звоняць і крычаць. (В.Гардзей)

10. Спішыце. Вызначце тып першага сказа, папярэдне расставіўшы прапушчаныя знакі прыпынку. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Словы матчынай мовы
Роем руплівым кружыце
На вуснах водар мядовы
Ліпы красак і ружы.

Мёд па крупінцы збіраеце
За лясамі, гарамі высокімі.
Пахнуць і сонца, і раніца
Вашымі сотамі.

У.Карызна

11. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Цёпламу яснаму дню радуецца кожная жывая істота. Над маёй галавой на бярозе цінькаюць бесклапотныя сініцы прабуюць моц сваіх крылляў імкліва носячыся ў небе прыгожыя ластаўкі.

Іван Навуменка

12. Прачытайце. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Потым пахаладала – спахапілася восень, зацягнула хмарамі неба. А вось сёння, праз колькі халодных дзён кастрычніка, зноў раскашуецца сонца і ціхая-ціхая цеплыня – здаецца нават, што бабіна лета вярнулася зноў, каб адбыць у полі хоць колькі яшчэ дзён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Спішыце другі сказ, расстаўляючы знакі прыпынку; зрабіце яго пунктуацыйны разбор.

Усяму жывому зямля дорыць шчодрасць. Запярэсцілі радуючы вока рознакаляровыя краскі на ўзмежку і пожнях расце збажына а поруч з ёй вылазіць лапушысты асот раскідвае галінкі свірэпка змешваецца з жытняй і пшанічнай рунню парнік выцягваецца над суседзямі іглісты хвошч. Кожнае каліўца імкнецца ўхапіць больш святла, паветра і цеплыні.

Тарас Хадкевіч

14. Спішыце другі сказ, зрабіце яго пунктуацыйны разбор, а таксама іншыя ўказаныя віды разбору.

Неба гэтымі днямі сінела чыстае і глыбокае. Яно не было цяпер такое яркае, як раней, часта атульвала яго белаватая, нібы малочная, смуга, і яно здавалася бляклым, быццам выгаралым за ліпеньскую і жнівеньскую спёку.

Іван Мележ

15. Спішыце, афармляючы дыялог у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Міця дайшоў з сябрамі да базарнай плошчы.

Ну, бывайце падаў ён руку Івану. Затым Нупрэю.

Бывай проста сказаў Іван.

Мы табе напішам прамовіў Нупрэй. І ты нам пішы.

Ніхто з траіх не памкнуўся абняцца, пацалавацца – хлопцы лічылі гэта непатрэбнымі сентыментамі...

Іван Навуменка

16. Спішыце сказ і вызначце яго тып. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Быццам віруе вір, верацяно верціцца адно толькі наўкола самога сябе і, “перацягваючы” разбэрсанае ў спарадкаванае, няпэўнае ў пэўнае, верыць, што яно цэнтр рэчаіснасці.

Алесь Разанаў

17. Прачытайце. Зрабіце ўказаныя разборы слоў. У апошнім сказе пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх.

Старая прыдарожная сасна... Часта калі я сцежкай прахаджу міма яе з сасны гэтай з яшчэ не бачнай вышыні мяне... абстуквае як пальцы доктара дробнае энергічнае гулкае тук-тук тук-тук!

Янка Брыль

18. Спісаць, расстаўляючы знакі прыпынку; вызначыць тып сказа і зрабіць указаныя віды разбору.

Калі цягнік крануўся з вакзала Міша доўга і заўзята махаў рукой услед і яму шкада было што гэта блакітнавокая светлавалосая дзяўчынка ў валёнках жоўтым кажушку і шарсцяной хустцы паехала кудысьці далёка-далёка.

Тарас Хадкевіч

19. Прачытайце, зрабіце пунктуацыйны разбор сказа. Выканайце іншыя ўказаныя віды разбору.

Калі ўлічыць, што ноўгарадцы выставілі супраць Васіля Цёмнага 5000 чалавек (“раць веліка вельмі”, – сказаў летапісец), калі ведаць, што ў Суздальскім баі з Васілём Цёмным было толькі 41500 тысяч войск, хаця з ім былі князі Мажайскі, Вярэйскі і Серпухаўскі, практычна ўсе сілы Маскоўскага княства, без Шамякі, - тады Грунвальд не можа не здзіўляць.

Уладзімір Караткевіч

20. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Зрабіце ўказаныя віды разбору.

Барадулін чараўнік народнага слова.

Пэўна як ні ў каго іншага з ягоных сучаснікаў паэтычнае слова ў Барадуліна зіхаціць і пераліваецца ўсімі колерамі як у вясёлцы гучыць як бубен і спявае бы скрыпка.

*Васіль Быкаў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Лабараторная праца**
**Тэма: Лексікалогія**

**Заданне 1.** Растлумачыць матывацыю (семантычную прымету назвы) наступных слоў:

| | |
|---|---|
| а) байка, даёнка, дзьмухавец, скрутак, плынь, парэчкі, аблічча, немаўля, ватоўка, дзяркач, дабрабыт, бездань; | б) чутка, бадай, надвор'е, становішча, сподак, садавіна, адозва, карычневы, віраваць, разруха, апенька, бялізна. |

**Заданне 2.** Вызначыць аснову пераносу значэння (прасторавая сумежнасць, часавая сумежнасць, падабенства функцыі, знешняе падабенства і інш.);

| | |
|---|---|
| а) чорныя вусы – вусы гароху;<br>дубовы клін – жураўліны клін;<br>магутны выбух – выбух смеху; | б) зубок дзіцяці – зубок часнаку;<br>кола інтарэсаў – кола веласіпеда;<br>рэакцыя на музыку – хімічная рэакцыя. |

**Заданне 3.** Размяжуйце выпадкі полісеміі і аманіміі:

| | |
|---|---|
| а)*крытычны артыкул – крытычны ўзрост;<br>* працаваць у аўтобусным парку – зжаўцелыя дрэвы ў парку;<br>*замарозіць фонды – замарозіць ягады; | б)*звязка ключоў – расцяжэнне звязак – дзеяслоў-звязка;<br>*вусны пераказ – зграбныя тонкія вусны;<br>*дысцыпліна ў групе – новая дысцыпліна ў вучэбным плане. |

**Заданне 4.** Вызначыць віды сінонімаў, назваць дамінанту:

| | |
|---|---|
| а) асілак, велікан, тытан;<br>дарога, шлях, тракт, шаша;<br>недахоп, дэфект, брак;<br>крычаць, гарлапаніць,галёкаць; | б) грамада, талака, кагал, натоўп;<br>ісці, крочыць, плесціся, цягнуцца, дыбаць;<br>дубець, мерзнуць, зябнуць;<br>варты, добры, прыстойны. |

**Заданне 5.** Падабраць антонімы да наступных слоў:

| | |
|---|---|
| а) ціха (чытаць, сядзець, ісці);<br>ясны (дзень, твар, пытанне); | б) лёгкі (адносіны, сукенка, сумка);<br>родны (чалавек, край, мова). |

**Заданне 6.** Вызначыць, з якой мовы запазычаны словы. Падкрэсліць адметныя рысы мовы-крыніцы:

| | |
|---|---|
| а) кудлаты, рыдлёўка, курган, арышт, кошт, фае, купэ, трэнінг, дашчэнту, допінг, цэнзура, эўрыка, апанент, шпіталь, сінтаксіс, экскурсія, інтэрпрэтацыя; | б) вестыбюль, вяндліна, трумо, балык, дысертацыя, форум, укленчыць, інцыдэнт, эўфемізм, трыумвірат, штаб, пудынг, бурштын, маркетынг, парэнчы, атава, сінус. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданне 7.** Вызначыць віды дыялектных слоў:
**а)** мэрам (быццам); скома ( аскома); хвэст (фэст); ветліца (дарога); чалавек (муж); штрап (штраф); чайка (лодка); сырніца (страва з творагу, яйка і малака на Віцебшчыне); пявун (певень);

**б)** яблука (яблык); рубель (жэрдка); дрыгво (дрыгва); пяюн (певень); шчотка (мох); лівец (безрукаўка); хутко (хутка); кіт (замазка); сечка (невялікая сякерка для рубкі мяса ў Заходняй Беларусі).

**Заданне 8.** Вызначыць віды жарганізмаў:

| | |
|---|---|
| а) зубрыць (вучыць); | б) плаваць (на экзамене); |
| хвост (на экзамене); | кулёк (БДУКіМ); |
| керагаз (машына); | баранка (руль); |
| кастылі (ногі); | вуркаган (злодзей); |
| граблі (рукі); | бакі (бакенбарды); |
| факі (факультатывы); | продкі (бацькі); |
| урка (злодзей); | тэлек (тэлевізар); |
| дэкі (дзяржэкзамены); | фоцік (фотаапарат). |

**Заданне 9.** Назваць віды архаізмаў:
**а)** весь (вёска); абставы (абставіны); міт (міф); друглы (другі); скрыжалі (закон); раме (плячо); квас (любы напітак); вежа ( шацёр); блуд (памылка); паганец (язычнік) ;
**б)** дзейца (дзеяч); чароўны (удзячны); балота (гразь, смецце, гной); страляць (пускаць стрэлы); салаш (шалаш); кляса (клас); гімнасія (гімназія); бебраны (бабровы); цытрына (лімон); лятун (лётчык.

**Заданне 10.** З наступнымі словамі скласці ЛСП:
**а)** есці, доблесны;

**б)** называць, вецер.

**Заданне 11.** Зрабіць лексічны аналіз выдзеленых слоў:
**а)** Сасоннік <u>**дыхае**</u> парнай жывіцай, а белая грэчка – нагрэтым <u>**мёдам**</u>… (Я.Брыль);
**б)** <u>**Хмары**</u> <u>**хутка**</u> плылі па небе, а з імі ўцякаў і дождж з далёкімі раскатамі грому (П.Пестрак).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Навукова-творчыя пытанні для студэнтаў БДУКМ**

1. Прачытайце вершаваныя радкі і назавіце аўтара. У адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі пастаўце знакі прыпынку ў сказах.

Вызначыце ідэю верша. Выпішыце вобразныя сродкі (тропы і фігуры), якімі карыстаецца аўтар для яе раскрыцця.

Ёсць паданне вякоў што разбурыць каліс
Вавілонскую Вежу Адам
І няўмольна сальюцца мовы зямлі
У адну няродную нам.
І мая безвыходна пойдзе ў змрок
У атрутны як вечнасць цень
Трапяткая і сіняя як васілёк
Гарачая як прамень.
Я ні шчасця ні будучых дзён не жадзён
Хай пятля хай памерці ў журбе
Хай не будзе ні шчасця ні будучых дзён
Калі ў іх не будзе цябе.

*Для даведак:* Прыведзены радкі з верша “Мова”, прысвечанага Янку Брылю. У радках ёсць уласны назоўнік аманімічны імю персанажа аднаго з твораў гэтага ж аўтара.

2. Выканайце на выбар адно з заданняў (***а*** ці ***б***).

Вядома, што адной з асаблівасцяў мовы скорагаворак з’яўляюцца гукапаўторы.

а) Пасля скорагаворкі выпішыце гукі, якія дапамагаюць у стварэнні твора:

Бульба з булкай біліся, біліся, бульба булцы як дала, булка сплюшчылася.
Нёс Рыгор пірог за парог, стаў на гарох, упаў на парог.

Выкарыстоўваючы паранімію і паранамазію, складзіце ўласную скорагаворку.

б) Выпішыце словы з прыстаўкай **папа-** і акрэсліце яе значэнне. Выпішыце словы з дзвюма прыстаўкамі. Зрабіце фанетычны аналіз двух найбольш ужывальных гукаў.

Папераапраналіся і папраставалі ў пералескі. Папаблудзілі, папавандравалі, папапоўзалі па падапрэлых папаратніках. Папавышуквалі, папазбірвалі падбалацянак, падгруздкаў, пярэстых парасонікаў, папагрузілі ў палукашак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ну й паперабіралі, папачысцілі! Папрадаць не папрадалі: паабварвалі, папапераварвалі, паперасольвалі, паперасмажвалі – папарадкавалі.

(Паводле П.Місько)

3. Якія гукі Б.А.Тарашкевіч называе “сычачымі”: свісцячыя ці шыпячыя? Параўнайце форму і змест былога і сучаснага тэрмінаў. Адкажыце, які з іх, на Вашу думку, больш канкрэтна характарызуе адпаведную моўную з’яву.

4. Чаму беларуская мова адносіцца да кансанантнага тыпу моў? Дакажыце гэта і вызначыце па запісаных літарах прозвішчы вядомых пісьменнікаў:

Б г д н в ч, К л с, Б р д л н, С п к ў, Д й н к, Р б л ў с к, Н в р ч, М т л ц к, Л й к ў.

5. Дакажыце, што ў кожнай лексеме жыве не менш як два словы. Запішыце назву дадзенай моўнай з’явы.

Гары, падаў, частую, казак, рады, кранаў, парай, прыстань, твары, любы.

*Для даведак*: тлумачце словы шляхам стварэння словазлучэнняў або шляхам апісання граматычных катэгорый прыведзеных часцін мовы.

6. Пастаўце націскі ў словах. Якія са слоў маюць акцэнталагічныя варыянты?

Знахар, хлусіць, тварог, піцэрыя, рыбак, вальдшнэп, камбайнер, рэкруцкі, маленькі, хабар, хіба, бахча, лектары, католік, выпадак, феерыя, арахіс.

7. Пісьмова расшыфруйце абрэвіятуры.

Райана, юннат, прараб, прафкам, бомж, ДАІ, ААН, БДУКМ, АН.

8. Падбярыце роднасныя ці аднаструктурныя словы да лексем *садоўнік* і *садавод*, каб даказаць, што ў адным з іх ёсць афікс, а ў другім – афіксоід.

9. У 18 ст. М.В.Ламаносаў вылучае восем часцін мовы: імя, займеннік, дзеяслоў, дзеепрыметнік, прыслоўе, прыназоўнік, злучнік, выклічнік. Запішыце назвы ўсіх часцін мовы, якія існуюць у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Параўнайце дзве класіфікацыі, а затым адкажыце на пытанні: а) чым адрозніваюцца прыслоўі ад безасабова-прэдыкатыўных слоў; б) ці магчыма дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе разглядаць як самастойныя часціны мовы, а не як формы дзеяслова, абгрунтуйце адказ; в) растлумачце сэнс тэрміна *пранаміналізацыя*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Паразважайце, чаго не хапіла словам *макраступы (галёшы), кантаслуп (прызма), дыялектыка (пустаслоўе), дальнегаварыльня (тэлефон), шкраб (школьны работнік),* каб “прапісацца” ў літаратурнай мове.

11. Што агульнае (форма, змест, форма і змест) ці нічога агульнага ў наступных слоў?

Міт і міф, вресень і верасень, канёк і конік, бусел і шэры, чароўны і ўдзячны, пенсія і стыпендыя, знічка і зорка, кум і сум, інтэрнэт і інтэрнат, вакацыі і канікулы, жах і страх, салаш і шалаш, прэцэдэнт і прэтэндэнт, антракт і перапынак, пачуцце і пачуццё. Якія з прыведзеных слоў з’яўляюцца паронімамі?

12. Да прыведзеных перыфрастычных выразаў падбярыце словы-сінонімы:

беларускі хлеб, хлеб сэрца;
каралева мовазнаўства, каралева спорту, каралева палёў;
цар грыбоў, цар звяроў;
горад над Нёманам, горад над Бугам, горад нафтавікоў Беларусі;
сынаў сын, сын зямлі, сын паўдзённай зямлі, сыны Элады;
паўночны рыс, паўночны шоўк, паўночная сталіца;
мераць неба, мераць раку;
прыпадаць да мудрасці кніг, прыпадаць да сэрца.

13. Прыдумайце для кожнага з прыведзеных выразаў 2 кантэксты: у першым выпадку выраз будзе ўжывацца з прамым значэннем, у другім – з пераносным.

Браць лейцы ў свае рукі, абкруціць вакол пальца, вады ў рот набраў, вылятаць з гнязда, асінае гняздо, атрымаць гарбуз, пракаціць на вараных, гладзіць па шэрсці, насіць на руках, зматаць вуды.

* З выразамі, якія ўжыты з пераносным значэннем, пажадана скласці звязны тэкст.

14. Дапішыце прыказкі. Які раздзел мовазнаўства вывучае названую моўную з’яву і пры якой умове?
З вялікае хмары … … .
З яблыні – яблык, а з елкі –… .
Ядуць на свеце хлеб траякі: …, … і … .
Адзін пень гарэў, а другі … … .
У каго веды – у таго … .
Зяць любіць… .

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не меўшы ў галаве, не кладзі на … .
Без гаспадара гумно плача, а без гаспадыні … .
З музыкі і млынара не будзе… .

15. І жартам і ўсур’ёз: адкажыце сур’ёзна на жартоўныя моўныя пытанні.
Які журавель не лятае?
Назавіце як мага больш слоў, якія маюць 100 зычных.
Які часопіс можна пасадзіць ля дома?
Чым адрозніваецца елка ад ёлкі?
Якая кветка гаворыць, што яе дзве цвіце, а сама адна расце?
Які звер ведае, дзе мёд шукаць?
Назва якога часопіса гарыць?

16. Запішыце па-беларуску назвы садавіны і гароднiны, якія “ўслаўлялі” ў сваіх казках народы свету. Таксама запішыце назвы казак.

17. Прачытайце ўрывак і адкажыце: а) з якой мэтай уводзіцца іншамоўны выраз у мастацкі тэкст; б) як называецца дадзеная моўная з’ява; в) ці сустракаецеся вы з гэтай моўнай з’явай у паўсядзённым жыцці? Падмацуйце адказ прыкладамі.

Сіверту быў аказаны найвялікшы давер – разам з пісцом з Марыенбурга манахам Торвальдам ён павінен быў напісаць тэкст дагавора на пергамене, каб сучаснікі і нашчадкі, што яшчэ народзяцца, маглі пераканацца ў чалавекалюбстве царквы…

Сіверт з найвялікшай стараннасцю рабіў сваю справу, але хутка стамляўся. Пачалі балець вочы, дрыжала рука. Тады ён з дазволу легата піў віно, клаўся спаць і наогул паводзіў сябе дзёрзка, бо ***doctoribus atque poetis omnia licent*** (лац.)

Л.Дайнека (Жалезныя жалуды)

Па магчымасці запішыце пераклад выдзеленых слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэст 1. Слова, яго ўласцівасці (значэнне і спалучальнасць, без кантэксту ці ў мінікантэксце–словазлучэнні)

**Заданне I.** Выпішыце нумары радоў слоў, у якіх усе словы з'яўляюцца матываванымі з пункту погляду сучаснай мовы:

1) васемнаццаць, надвор'е, мора, скруха, сумёт;
2) дзьмухавец, дажынкі, веснавы, арэлі, сподак;
3) гушкалка, бярэзнік, пярсцёнак, тхор, бездапаможны;
4) раўнадушны, чутка, плынь, мыла, маліннік;
5) падушка, вопратка, бадай, летні, сад.

**Заданне II.** Укажыце колькасць словазлучэнняў, у якіх ёсць словы, ужытыя з пераносным значэннем:

цёплая вада, цёплая сукенка, цёплыя адносіны; лёгкі вецер, лёгкая сумка, лёгкі на пад'ём; тонкі густ, тонкая кніга, тонкая душа; залатое сэрца, залатыя сны, залаты бранзалет; белая столь, беленькі малойчык, белыя яблокі.

1) 7
2) 5
3) 10
4) 8
5) 9

**Заданне III.** Выпішыце нумары пар слоў, у якіх назіраецца з'ява антаніміі:
1) радавацца – узрадавацца,
2) канчатак – флексія,
3) чорна – белы,
4) поўнач – поўдзень;
5) мёд – атрута.

**Заданне IV.** Выпішыце нумары радоў слоў, у якіх назіраецца сінанімія:
1) даўні, старажытны, архаічны, учарашні, стары;
2) танны, недарагі;
3) халодны, марозны, стылы, зябкі, азяблы;
4) ісці – валачы – валачыся – плесціся;
5) малы – маленькі – малюсенькі.

**Заданне V.** Выпішыце нумары радоў са словамі – амонімамі:
1) дапячы (бліны), дапячы (калегам);
2) дысцыпліна (вучэбная, прадмет), дысцыпліна (працоўная);
3) прамова (публіцыстычная), прамова (індаеўрапейская);
4) зорка (нябёсная), зорка (глядзець);
5) пракат (металу), пракат (шлюбных сукенак).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданне VI.** Выпішыце нумары антанімічных пар слоў:
1) за – перад;
2) багаты – небагаты;
3) рубеж – мяжа;
4) гэты – той;
5) паяўляцца – з'яўляцца.

**Заданне VII.** Выпішыце нумары пар слоў, звязаных паранімічнымі адносінамі:
1) дыпломнік – дыпламант;
2) комплекс – камплект;
3) камандзіроўка – камандзіровачны;
4) давер – даверлівасць;
5) пясчаны – пясочны.

**Заданне VIII.** Выпішыце нумары радоў са спрадвечнабеларускімі словамі адной лексіка – семантычнай групы:

1) сястра, цешча, мужык, сусед, айчым;
2) веліч, крыўда, журба, клопат, сон;
3) вячысты, гаротны, ацеслевы, бадзёры, махнаты;
4) зацірка, кулеш, дранікі, чарніцы, сырніца;
5) маркоціцца, уцякаць, дбаць, сумаваць, фарбаваць.

**Заданне IX.** Выпішыце нумары радоў слоў, запазычаных з адной мовы.

1) атаман, таракан, балык, авал, барабан;
2) анкета, віньетка, журы, таксі, ваяж;
3) гальштук, друк, шпроты, штыль, рукзак;
4) графа, граблі, гонта, гузік, агрэст;
5) гладыёлус, анатацыя, эліпс, эрудыцыя, філалогія.

**Заданне X.** Выпішыце нумары радоў слоў з экзатызмамі:

1) чэмпіянат, шалаш, рыкша, круіз, сакля;
2) барока, паранджа, сейм, лорд, авеню;
3) кімано, крона, чалма, аул, чардаш;
4) спікер, кіяскёр, клоун, дранікі, злоты;
5) шашлык, балык, паляндвіца, кулеш, груца.

**Заданне XI.** Выпішыце нумары радоў слоў з аднолькавымі тыпамі архаізмаў:

1) чароўны, пенсія, блуд, квас, таварыш;
2) міт, салаш, гімнасія, Менск, дзэканне;
3) перст, чало, вакацыі, лятун, абставы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) прасвета, бортнік, тлумач, лада, цытрына;
5) кляса, жырандоль, багамаз, цэканне, ланіты.

**Заданне XII.** Выпішыце нумары радоў слоў, якія складаюцца толькі з гістарызмаў:

1) хата-чытальня, ваяводства, цытрына, памесце;
2) вчынок, аканом, імбрычык, іспыты;
3) ратай, калясніца, кальчуга, лапці;
4) рэкрут, асадка, Вялікдзень, войт;
5) карэта, пенаты, меч, шчыт.

**Заданне XIII.** Выпішыце нумары радоў слоў, якія складаюцца толькі з лексем, ужыванне якіх абмежавана сферай, тэрыторыяй, сацыяльным асяроддзем:

1) Радаўніца, шкет, ратунак, відавочны, ціхі;
2) вакацыі, ветраны, цеканне, этнаграфія, дыплом;
3) жэрці, дрыхнуць, дэкі, лабы, фанетыка;
4) дуйка, анекдот, ветразь, абярэг, рыла;
5) дэкі, лабы, тэлек, снядак, жалезна.

**Заданне XIV.** Выпішыце нумары радоў дыялектызмаў аднаго тыпу:

1) гушчыня, пячкур, галасліва, сляпак ( сляпень);
2) лодар, рукаво, кохта, мігаўка ( вейка);
3) пранозліва, гавора, мабуць, векша (вавёрка);
4) гушчарнік, здрайца, картопля, мацярдушка (лясная мята);
5) нясець, вісна, пасоля, магазін.

**Заданне XV.** Выпішыце нумары радоў са словамі, якія маюць аднолькавую стылістычную афарбоўку.

1) донька, лёгкакрылы, ветразь, часцяком;
2) паэтка, суфікс, аксіёма, байка;
3) бурапеністы, ліставей, злучнік, дзеванька;
4) напарстак, плынь, непагадзь, марыць;
5) ліпкі, трываласць, скрыжалі, рамон.

**Заданне XVI.** Выпішыце нумары пар слоў, якія, нягледзячы на рознае паходжанне, маюць тоесныя значэнні:

1) афіша – аб'ява;
2) злучок – дэфіс;
3) увоз – імпарт;
4) дэфект – недахоп;
5) сімптом – прыкмета.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданне XVII.** Выпішыце з сінанімічнага рада лішняе слова:

ісці – валачыся – цягнуцца – плесці – плесціся – дыбаць – клыпаць.

**Заданне XVIII.** Выпішыце нумары сказаў з метафарамі:

1. А там, на радзіме, марозам убраны ў сцюдзёныя зоры стары медны бор (М.Танк);
2. На тонкіх рабеньkіх бярозках абапал гасцінца вось-вось павінны распусціцца клейкія зубчатыя лісточкі ( Я. Брыль);
3. Белаю чаромхавай завеяй зноў пялёсткі бераг замялі ( С. Грахоўскі);
4. Стомлены зімовы дзень схіляў ледзяное крыло, пачыналіся прыцемкі (Л.Дайнека);
5. Конюх, трымаючы лейцы, сядзеў у передку брычкі ( М. Машара).

**Заданне XIX.** Выпішыце нумары сказаў, у якіх ёсць з'ява метаніміі.

1. Незаўбаве хмара закрыла поўнеба, і над зямлёю навісла густая шэрая сетка дажджу ( М. Корзун);
2. Дзвіну на бераг цягнем
   У мокрых невадах ( Г. Бураўкін);
3. І жэніцца, і родзіць вёска слаба (Н. Гілевіч);
4. Будзень будзіць людзей, нагадваючы ім пра тое, што пачынаецца дзень…(А.Разанаў);
5. Да людзей горад новы прыйшоў (А.Пысін).

**Заданне XX.** Выпішыце нумары сказаў з сінекдахай.

1. Што ж засталося на душы? Нябёсы, сонца, лес ды жаўранак ( П. Панчанка);
2. Застолле адразу анямела, уткнула ў скацерку насы (Н. Гілевіч);
3. Пахла перакіслымі брусніцамі, прэлай саломай, прыхваченым першым замаразкам грыбам ( М. Лынькоў);
4. Шкадую, разумею ўсіх: Вас, людзі, Дрэва, Звера ( С. Законнікаў);
5. Лагодны жнівеньскі вецер надзімае бэзавы цюль ( А. Арлоў).

**Заданне XXI.** Выпішыце нумары сказаў з перыфразай.
1. Белы ветразь на сініх, на гордых, як мора, азёрах,
   І бары – акіяны, і неба – разлівы ільноў ( У. Караткевіч);
2. І ўсплывуць адгалоскі віны
   У душы пад сасной – векавухай ( Р. Барадулін);
3. У небе крохкім, жураўліным
   Журботна гукі паплылі ( С. Законнікаў);
4. Спрадвечная адмета восені – цішыня – жыла тут ( І. Пташнікаў);
5. У лесе пахмурным бярозы – белыя паланянкі ( А. Разанаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданне XXII.** Выпішыце са сказаў словы - сінонімы.

1. Зямля здаецца лёгкай, бязважнай, яна ўся дыхае цішай, спакоем (М.Лынькоў);
2. Дык які ж гэта дыспут, калі спрачаюцца ногі з галавою, а не сэрца з сэрцам, душа з душою? ( Я. Сіпакоў);
3. Бывала, у летнія вечары, як толькі клаліся змрокі, сяло пачынала жыць другім, вечаровым жыццём ( Я. Скрыган);
4. Воблакі бываюць высокія і нізкія. У два паверхі і нават у тры. Ёсць рэдкія і суцэльныя. Ёсць воблачкі. Ёсць хмаркі. Ёсць пахмаркі (І.Грамовіч).
5. Пішу я вершы. Шмат друкую, нямала радасці спазнаў…Ах, каб мне радасць зноў такую, як першы верш надрукаваў (П.Броўка).

**Заданне XXIII.** Выпішыце нумары сказаў са стылістычнымі прыёмамі, заснаванымі на антаніміі.

1. Я прыдумваю табе іншае імя,
   бо ці ж можна адным абысціся і
   зімою, і летам, удзень і уначы,
   пры растанні і сустрэчы з табой ( М. Танк);
2. Навокал іржышча, домікі бабак. Над намі – ціхі, азораны акіян ( Я. Брыль);
3. Жыць! Жыць і за жывых і мёртвых,
   чые сляды завеі замялі,
   за несмяротных смертнікаў чацвёртых,
   што больш ужо не пройдуць па раллі ( С. Грахоўскі);
4. Я знала, што з твайго языка капае і мёд, і яд ( М. Гроднеў);
5. Яна… засмяялася – шчаслівая і бесклапотна, любасна ўглядаючыся ў яго твар, які яшчэ гарэў ад сцюдзёнага апёку яе вуснаў ( В. Быкаў).

**Заданне XXIV.** Выпішыце нумары ўрыўкаў з тэкстаў, у якіх ужыты амонімы.

1. Трэба нам і захады і меры,
   Каб між светлых беларускіх рос
   Зноў расцвіў чаравічок венерын
   І званочак сіні ў лесе рос ( П. Панчанка);

2. Піце, дзетачкі, вы сокі,
   Каб ваш тонус быў высокі ( Н. Гілевіч);

3. – А дзе была ўчора ты?
   – А я хадзіла ў чараты… ( Р. Барадулін);

4. З журавін зрабіў каралі.
   Журавы мяне каралі,
   Што не ўсе яны паспелі,
   А дразды скляваць паспелі ( Г. Бураўкін);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Прылятае ён першым
   З далёкага выраю.
   Але людзі гавораць,
   Што гэта не так:
   Ён у норцы зімуе,
   Што крот яму яму выры ( Ю. Свірка).

**Заданне XXV.** Выпішыце нумары выпадкаў ужывання паронімаў.

1. Першы сорт. Пасляваенны выраб.
   Чым прырода апраўдала выбар? ( У. Някляеў);

2. О не, мадам! Для насалоды
   Ён не прыдасца, верш мой, вам.
   Я – не салонны, я – салёны.
   Вы памыліліся, мадам! ( Н. Гілевіч);

3. Хай, як тыя павукі,
   Не павучацца,
   Ласункі – ласункі
   Хай павучацца! ( Р. Барадулін);

4. Заспявалі,
   Загукалі
   Лес і пералескі,
   Засінелі,
   Зажаўцелі
   Лотаць і пралескі ( А. Бялевіч);

5. Словы – ветры на крылах птушыных,
словы – зоры са шляху сусветаў,
словы – перлы з нязнаных глыбіняў,
словы – будзьце слухмяны паэту! (Н.Арсеннева).

**Заданне XXVI.** Выпішыце нумары сказаў з індывідуальна-аўтарскімі неалагізмамі.

1. Вось ён мячык-скачык.
   Рассмяшу я мячык ( М. Маляўка);

2. А да Ланы –
   Хоць ты плач. –
   Часта ходзіць Раскідач ( Р. Барадулін);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Жорны “жораюць” пачастунак, варожачы, што ўрэшце з яго атрымаецца, ці корж, ці аладак, ці піражок… ( А. Разанаў);

4. А ён, Вялес, смяецца –
   Свайго і мы дажджом!
   І на зямельку льецца
   Дажджом ужо, дажджом… ( Я. Сіпакоў);

5. Як любая з жанчын,
   Можа некалі збегчы
   Ў цырульню папрАвіць прычоску
   Ці на патанцульку (М.Танк).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

### ЛІТАРАТУРА

для курса СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА
*для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (напрамак 1-23 01 11- 04 бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка) спецыялізацыя 1-23 01 11- 04 01 беларуская мова і літаратура)*

***Асноўная***


1. *Беларуская* граматыка: У 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ім. Я.Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. Ч.1 – 431 с.
2. *Беларуская* граматыка: У 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ім. Я.Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2. – 326 с.
3. *Беларуская* мова: цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / А.І.Падлужны, Л.Ц.Выгонная, Г.К.Усціновіч і інш.; Пад рэд. А.І Падлужнага. – Мн.: Нар. асвета, 1987. – 144 с.
4. *Бурак, Л.І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л.І.Буряк. – Мн.: БДУ, 1982. – 206 с.
5. *Бурак, Л.І.* Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л.І.Буряк. – Мн.: Універсітэцкае, 1987. – 320 с.
6. *Камароўскі, Я.М.* Сучасная беларуская мова: Фанетыка і фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія / Я.М.Камароўскі, Л.І.Сямешка. – Мн.: Універсітэцкае, 1985. – 175 с.
7. *Кечык, С.Я.* Моўны разбор у ВНУ і ў школе: Схемы, узоры, заданні: Вучэб. дапаможнік для пед. ін-таў / С.Я.Кечык, В.І.Рагаўцоў. – Мн.: Выш. шк., 1988. – 127 с.
8. *Клюсаў, Г.Н., Юрэвіч А.Л.* Сучасная беларуская пунктуацыя. – 2-е выд. – Мн., 1972.
9. *Крывіцкі, А.А.* Практыкум па фанетыцы беларускай мовы [для ВНУ] / А.А.Крывіцкі, А.І.Падлужны. – Мн.: Выш. шк., 1989. – 219 с.
10. *Лексікалогія* сучаснай беларускай літаратурнай мовы / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ім. Я.Коласа; А.Я.Баханькоў, В.П.Лемцюгова, Г.Ф.Вештарт і інш.; Пад рэд. А.Я.Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
11. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: Вуч. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ / І.Я.Лепешаў. – Мн.: Выш. шк., 1998. – 270 с.
12. *Наркевіч, А.І.* Практычны курс сучаснай беларускай мовы: Вуч. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ па спец. 02.14 “Журналістыка” / А.І.Наркевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1992. – 320 с.
13. *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Практычны курс / Т.Р.Рамза. – Мн.: БДУ, 2008. – 157 с.
14. *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Тэарэтычны курс / Т.Р.Рамза. – Мн.: БДУ, 2006. – 214 с.
15. *Сучасная* беларуская літаратурная мова: Уводзіны. Лексікалогія. Фразеалогія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для студэнтаў філал. фак. выш. навуч. устаноў /


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.Ц.Кавалёва, А.К.Юрэвіч, Ф.М.Янкоўскі і інш. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 1993. – 206 с.
16. *Сучасная* беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Дапам. Для студэнтаў філал. фак. ВНУ / Н.В.Гаўрош, М.Ц.Кавалёва, Н.М.Нямковіч; Пад агул. рэд. М.С.Яўневіча. – Мн.: Скакун, 1997. – 287 с.
17. *Сучасная* беларуская літаратурная мова: Практычныя заняткі / Бурак Л.І., Красней В.П., Лазоўская У.М. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 335 с.
18. *Сямешка, Л.І.* Курс беларускай мовы: Падручнік / Л.І.Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І.Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.
19. *Шакун, Л.М.* Словаўтварэнне / Л.М.Шакун. – Мн.: Выш. школа, 1978. – 128 с.
20. *Шуба, П.П.* Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія: [Вучэб. дапаможнік для філал. фак. ун-таў]. –Мн.: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.
21. *Янкоўскі, Ф.М.* Сучасная беларуская мова / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Выш. школа, 1984. – 176 с.
22. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларуская фразеалогія / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Нар. асвета, 1981. – 79 с.
23. *Яўневіч, М.С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С.Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мн.: Аверсэв, 2006. – 286 с.

***Дадатковая***

1. *Анічэнка, У.В.* Мовы ўсходніх славян: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. ВНУ] / У.В.Анічэнка. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 318 с.
2. *Анічэнка, У.В.* Марфалогія ўсходнеславянскіх моў: Назоўнік. Дзеяслоў. Прыслоўе: Дапаможнік па курсе параўн. граматыкі ўсходнеславянскіх моў / У.В.Анічэнка. – Мн.: Выш. шк., 1973. – 127 с.
3. *Булахаў, М.Г.* Прыметнік у беларускай мове / М.Г.Булахаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1964. – 199 с.
4. *Вештарт, Г.Ф.* Дзеепрыметнік у мове законаў / Г.Ф.Вештарт // Беларуская лінгвістыка. – Вып. 34. – Мн., 1988. – С. 35–40.
5. *Выгонная, Л.Ц.* Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа / Л.Ц.Выгонная. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 115 с.
6. *Гаўрош, Н.В.* Намінатыўныя сказы ў сучаснай беларускай мове / Н.В.Гаўрош. – Мн.: Выш. школа, 1975. – 95 с.
7. *Жыдовіч, М.А.* Назоўнік у беларускай мове. У 2-х частках. / М.А.Жыдовіч. – Мн.: Выд. БДУ, 1969.
8. *Кечык, С.Я.* Дзеепрыслоўе у беларускай мове: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў / С.Я.Кечык.– Мн.: Выш. школа, 1985. – 88 с.
9. *Клышка, А.К.* Пра лямант "уючых" і "лямантуючых" / А.К.Клышка. // Полымя. – 1964. – № 7. – С. 162–170.
10. *Крывіцкі, А.А.* Фанетыка беларускай мовы: [Вучэб. дапаможнік для філфакаў ВНУ] / А.А.Крывіцкі, А.І.Падлужны. – Мн.: Выш. шк., 1984. – 269 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Лепешаў, І.Я.* Практыкум па беларускай мове / І.Я.Лепешаў, Г.М.Малажай, К.М. Панючыц. – Мн.: Універсітэтскае, 2001. – 319 с.
12. *Малажай, Г.М.* Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм / Г.М.Малажай. – Мн., 1992. – 290 с.
13. *Малажай, Г.М.* Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове: Вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ. – 2-е выд., дапрац. і дап. / Г.М.Малажай, Т.М.Кананенка. – Мн.: Выш. шк., 1999. – 299 с.
14. *Наркевіч, А.І.* Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І.Наркевіч. – Мн.: Выд-ва БДУ, 1976. – 239 с.
15. *Наркевіч, А.І.* Словазлучэнне ў беларускай мове / А.І.Наркевіч. – Мн., 1972. – 336 с.
16. *Падлужны, А.І.* Гукі беларускай мовы / А.І.Падлужны, В.М.Чэкман. – Мн.: Навука і тэхніка, 1973. – 264 с.
17. *Сцяшковіч, Т.П.* Займеннік у беларускай мове / Т.П.Сцяшковіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1977. – 259 с.
18. *Цікоцкі, М.Я.* Стылістыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. для фак. журналістыкі / М.Я.Цікоцкі. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 294 с.
19. *Шуба, П.П.* Дзеяслоў у беларускай мове / П.П.Шуба. – Мн.: Выд. БДУ, 1968. – 82 с.
20. *Шуба, П.П.* Прыназоўнік у беларускай мове / П.П.Шуба. – Мн.: Выд. БДУ, 1971. – 224 с.
21. *Шуба, П.П.* Прыслоўе у беларускай мове. Марфалагічны нарыс / П.П.Шуба. – Мн.: Акад. навук БССР, 1962. – 194 с.
22. *Юргелевіч, П.Я.* Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі: Вучэб. дапаможнік для студэнтаў-завочнікаў філал. фак. ВНУ БССР. Пад рэд. М.С.Яўневіча. – Мн.: Выш. шк., 1974. – 302 с.
23. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Нар. асвета, 1976. – 95 с.
24. *Яўневіч, М.С.* Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове: Прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі з прасторавым значэннем / М.С.Яўневіч. – Мн.: Выд-ва БДУ, 1977. – 279 с.

***Слоўнікі***

1. *Арашонкава, Г.У.* Кароткі слоўнік беларускай мовы : Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава; пад рэд.В.І.Рабкевіча. – Мн. : Маст. літ., 1994. – 367 с.
2. *Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П.* Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік / Пад рэд. М.В.Бірылы, А.І.Падлужнага. – Мн.: Выш. школа, 1991. – 303 с.
3. *Арашонкава, Г.У., Лемцюгова В.П.* Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Пад рэд. М.В.Бірыла, А.І.Падлужнага. – Мн.: Выш. шк., 1987. – 210 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Бардовіч, А.М.* Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы: Вучэб дапам. Для агульнаадукац. шк., ліцэяў, гімназій / А.М.Бардовіч, М.М.Круталевіч, А.А.Лукашанец – Мн.: Бел. навука, 2000. – 413 с.
5. *Бардовіч, А.М., Шакун, Л.М.* Марфемны слоўнік беларускай мовы. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. школа, 1989. – 718 с.
6. *Беларуская* мова: Энцыклапедыя. – Мн., 1994.
7. *Беларускія* прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Складальнік Ф.М.Янкоўскі. –3-е выд. –Мн., 1992.
8. *Бірыла, М.В.* Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / М.В.Бірыла. – Мн.: БелСЭ, 1987. – 903 с.
9. *Булыка, А.М.* Слоўнік іншамоўных слоў: [Каля 25 тыс. слоў і тэрмінаў: У 2 т.]. – Мн.: Бел. Энцыкл., 1999.
10. *Гаўрош, Н.* Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. Гаўрош. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 586 с.
11. *Гістарычны* слоўнік беларускай мовы. – Вып. 1–18. – Мн., 1982–1999.
12. *Грабчыкаў, С.М.* Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М.Грабчыкаў. – Мн.: Нар. асв., 1994. – 478 с.
13. *Клышка, М.К.* Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К.Клышка. – Мн.: ПУП “Радыёла-плюс”, 2005. – 672 с.
14. *Клышка, М.К.* Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. – 2-е выд. – Мн., 1993.
15. *Лазоўскі, М.У.* Слоўнік антонімаў беларускай мовы / М.У.Лазоўскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 354 с.
16. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т.: Каля 6000 фразеалагізмаў. – Мн.: Бел. Энцыкл. ім. П.Броўкі, 1993.
17. *Малажай, Г.М.* Беларуская перыфраза / Г.М.Малажай. – Мн., 1974.
18. *Руска-беларускі* слоўнік: У 3-х т. – Мн., 1999.
19. *Старычонак, В.Д.* Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д.Старычонак. – Мн.: Выш. школа, 1991. – 255 с.
20. *Сцяцко, П.У.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У.Сцяцко, М.Ф.Гуліцкі, Л.А.Антанюк. – Мн.: Выш. школа, 1990. – 222 с.
21. *Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; [І.М.Бунчук, М.Н.Крыўко, З.М.Кудрэйка і інш.]; Пад рэд. Р.М.Судніка, М.Н.Крыўко. – Мн.: Бел. Энцыкл., 1996. – 784 с.
22. *Тлумачальны* слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; (Пад агул. рэд. акад. К.Атраховіча). – Мн.: БелСЭ, 1978-1984.
23. *Шуба, П.П.* Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П.Шуба. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 167 с.
24. *Шкраба І.Р., Шкраба, Р.В.* Крынічнае слова: беларускія прыказкі і прымаўкі / І.Р.Шкраба, Р.В.Шкраба. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 286 с.
25. *Этымалагічны* слоўнік беларускай мовы / АН Беларусі; Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа ; Уклад. Г.А.Цыхун і інш., Рэд. В.У.Мартынаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979-1993. Т. 1-8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

26. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларускія народныя параўнанні / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Выш. школа, 1973. – 239 с.
27. *Янкоўскі, Ф.М.* Крылатыя словы і афарызмы. З літаратурных крыніц. – Мн.: Акад. навук БССР, 1960. – 135 с.

**ЛІТАРАТУРА для студэнтаў ФТБКіСМ**

## *Асноўная*

1. *Беларуская* граматыка: У 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ім. Я.Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. Ч.1 – 431 с.; 1986. Ч. 2. – 326 с.
2. *Беларуская* мова: цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / А.І.Падлужны, Л.Ц.Выгонная, Г.К.Усціновіч і інш.; Пад рэд. А.І Падлужнага. – Мн.: Нар. асвета, 1987. – 144 с.
3. *Бурак, Л.І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л.І.Бурак. – Мн.: БДУ, 1982. –206 с.
4. *Бурак, Л.І.* Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л.І.Бурак. – Мн.: Універсітэцкае, 1987. – 320 с.
5. *Гуліцкая, В.А., Пісарэнка, А.М.* Культура мовы / В.А.Гуліцкая, А.М.Пісарэнка. – Мн.: БДУКМ, 2006. – 106 с.
6. *Лепешаў, І.Я.* Практыкум па беларускай мове / І.Я.Лепешаў, Г.М.Малажай, К.М. Панюціч. – Мн.: Універсітэтскае, 2001. – 319 с.
7. *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Практычны курс / Т.Р.Рамза. – Мн.: БДУ, 2008. – 157 с.
8. *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Тэарэтычны курс / Т.Р.Рамза. – Мн.: БДУ, 2006. – 214 с.
9. *Сучасная літаратурная мова*: Уводзіны. Лексікалогія. Фразеалогія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для студэнтаў філал. фак. выш. навуч. устаноў / М.Ц.Кавалёва, А.К.Юрэвіч, Ф.М.Янкоўскі і інш. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 1993. – 206 с.
10. *Сучасная літаратурная мова*: Марфалогія: Дапам. Для студэнтаў філал. фак. ВНУ / Н.В.Гаўрош, М.Ц.Кавалёва, Н.М.Нямковіч; Пад агул. рэд. М.С.Яўневіча. – Мн.: Скакун, 1997. – 287 с.
11. *Сямешка, Л.І.* Курс беларускай мовы: Падручнік / Л.І.Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І.Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.
12. *Цікоцкі, М.Я.* Стылістыка беларускай мовы / М.Я.Цікоцкі. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 294 с.
13. *Яўневіч, М.С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С.Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мн.: Аверсэв, 2006. – 286 с.

## *Дадатковая*

1. *Камароўскі, Я.М.* Сучасная беларуская мова: Фанетыка і фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія / Я.М.Камароўскі, Л.І.Сямешка. – Мн.: Універсітэцкае, 1985. – 175 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Каўрус, А.А.* Стылістыка беларускай мовы / А.А Каўрус. – Мн.: Нар. асвета, 1992. – 207 с.
3. *Клюсаў, Г.М.* Асновы і нормы сучаснай беларускай пунктуацыі / Г.М. Клюсаў. – Мн., 1993. – 234 с.
4. *Лексікалогія* сучаснай беларускай літаратурнай мовы / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ім Я.Коласа; Я.Баханькоў, В.П.Лемцюгава, Г.Ф.Вештарт і інш.; пад рэд. А.Я.Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
5. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: вуч. дапам. для студ. філал. фак. ВНУ / І.Я.Лепешаў. – Мн.: Выш. шк., 1998. – 270 с.
6. *Наркевіч, А.І.* Практычны курс сучаснай беларускай мовы / А.І.Наркевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1992. – 320 с.
7. *Пісарэнка, А.М.* Функцыянальная стылістыка беларускай мовы – А.М.Пісарэнка. – Мн.: БДУКМ, 2003. – 91 с.
8. *Прыгодзіч, М.Р.* Шчодрасць слова / М.Р.Прыгодзіч. – Мн.: Універсітэцкая, 1990. – 79 с.
9. *Сучасная літаратурная мова*: Арфаграфія і пунктуацыя: Практыкум: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. ВНУ / Бурак Л.І., Бурак І.Л. – Мн.: Універсітэцкае, 1993. – 247 с.
10. *Сучасная літаратурная мова*: Марфалогія. Вучэб. Дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў. / Я.М.Адамовіч, Н.В.Гаўрош, М.Ф.Гуліцкі і інш.; Пад рэд. Ф.М.Янкоўскага. – 2-е выд., дапрац. – Мн.: Выш. школа, 1980.– 238 с.
11. *Сучасная літаратурная мова*: Практычныя заняткі / Бурак Л.І., Красней В.П., Лазоўская У.М. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 335 с.
12. *Сцяцко, П.У.* Культура мовы / П.У.Сцяцко. – Мн.: Тэхналогія, 2002. – 444 с.
13. *Юрэвіч, А.К.* Стылістыка беларускай мовы / А.К.Юрэвіч. – Мн. : Выш. шк., 1992. – 288 с.
14. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Нар. асвета, 1976. – 95 с.
15. *Янкоўскі, Ф.М.* Сучасная беларуская мова / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Выш. школа, 1984. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Слоўнікі*

1. *Арашонкава, Г.У.* Кароткі слоўнік беларускай мовы : Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава; пад рэд.В.І.Рабкевіча. – Мн. : Маст. літ., 1994. – 367 с.
2. *Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П.* Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік / Пад рэд. М.В.Бірылы, А.І.Падлужнага. – Мн.: Выш. школа, 1991. – 303 с.
3. *Бардовіч, А.М.* Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы: Вучэб дапам. Для агульнаадукац. шк., ліцэяў, гімназій / А.М.Бардовіч, М.М.Круталевіч, А.А.Лукашанец – Мн.: Бел. навука, 2000. – 413 с.
4. *Бардовіч, А.М., Шакун, Л.М.* Марфемны слоўнік беларускай мовы. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. школа, 1989. – 718 с.
5. *Беларуска-рускі* слоўнік: у 2 т.– Мн., 1988 – 1989. – 2 т.

6. *Беларуская мова*: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я.Міхневіча. – Мн.: Бел. Эн., 1994. – 655 с.
7. *Бірыла, М.В.* Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / М.В.Бірыла. – Мн.: БелСЭ, 1987. – 903 с.
8. *Булыка, А.М.* Слоўнік іншамоўных слоў: [Каля 25 тыс. слоў і тэрмінаў: У 2 т.]. – Мн.: Бел. Энцыкл., 1999.
9. *Гаўрош, Н.* Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. Гаўрош. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 586 с.
10. *Грабчыкаў, С.М.* Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М.Грабчыкаў. – Мн.: Нар. асв., 1994. – 478 с.
11. *Клышка, М.К.* Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К.Клышка. – Мн.: ПУП "Радыёла-плюс", 2005. – 672 с.
12. *Лазоўскі, М.У.* Слоўнік антонімаў беларускай мовы / М.У.Лазоўскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 354 с.
13. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т.: Каля 6000 фразеалагізмаў. – Мн.: Бел. Энцыкл. ім. П.Броўкі, 1993.
14. *Прыгодзіч, М.Р.* Асобна, разам, праз дэфіс. Слоўнік-даведнік / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск, 1994. – 256 с.
15. *Русско-белорусский* словарь: В 3 т. Ок. 110000 слов / АН Беларуси, Ин-т языкознания им. Я.Коласа и др. – 4-е изд. испр. и доп. – Мн.: "Беларус. Энцыклапедыя" им. П.Бровки, 1993.
16. *Слоўнік* цяжкасцяў беларускай мовы / Б.А.Плотнікаў, В.П.Трайкоўская. – Мн.: Кніжны Дом, 2004. – 544 с.
17. *Старычонак, В.Д.* Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д.Старычонак. – Мн.: Выш. школа, 1991. – 255 с.
18. *Сцяцко, П.У.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У.Сцяцко, М.Ф.Гуліцкі, Л.А.Антанюк. – Мн.: Выш. школа, 1990. – 222 с.
19. *Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; [І.М.Бунчук, М.Н.Крыўко, З.М.Кудрэйка і інш.]; Пад рэд. Р.М.Судніка, М.Н.Крыўко. – Мн.: Бел. Энцыкл., 1996. – 784 с.
20. *Тлумачальны* слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; (Пад агул. рэд. акад. К.Атраховіча). – Мн.: БелСЭ, 1978-1984.
21. *Шкраба І.Р., Шкраба, Р.В.* Крынічнае слова: беларускія прыказкі і прымаўкі / І.Р.Шкраба, Р.В.Шкраба. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 286 с.
22. *Шкраба, І.Р.* Самабытнае слова: Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Р.Шкраба. – Мн.: Бел Эн, 1994. – 234 с.

*Этымалагічны* слоўнік беларускай мовы / АН Беларусі; Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа ; Уклад. Г.А.Цыхун і інш., Рэд. В.У.Мартынаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979-1993. Т. 1-8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ